Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая ГАЗЭТА

СЯРАДА
19 КАСТРЫЧНІКА 1932 г.
№ 232 (3611)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сэктароў . . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не звяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары

ПЕРАДАВЫ—АРТЫКУЛЫ: Зьвярнуць пераходны чырвоны сьцяг.

С. КУРАЧКІН: Праца лёгкай прамысловасьці за тры кварталы 1932 году (2-ая стар.).

І. А. ГАЛАЎНЁЎ: Аддзелы рацыяналізацыі і ячэйкі вынаходнікаў і вынаходаў шырэйшаму (3-яя стар.).

ЧЫРВОНЫМІ ЭШАЛЕНАМІ БУЛЬБЫ АДКАЗАЦЬ НА ЛІСТ ЛЕНІНГРАДЗКІХ РАБОЧЫХ (1-ая стар.).

За 1.200.000 тон сілосу (3-яя стар.).

Усе магчымасьці для выкананьня пляну маслазагатовак ёсьць.

Адкінуць заслоны «аб'ектыўных» прычын за які хаваюцца адстаючыя раёны (3-яя стар.).

Тэмпамі ўдарных брыгад Дундзінавай, Эліфа, Сьпявака, Брамбурга, Кухерава, Крашнева, і Шаўцова рыхтавацца да XV-гадавіны Кастрычніка (2-ая стар.).

Работу таварыства «ПН» узьняць на вышэйшую ступень (з уступкай прамовы тав. Чарвякова пры адкрыцьці III-га Усебеларускага зьезду таварыства «ПН») (2-ая стар.).

Ці так трэба змагацца за спагнаньне цьвёрдых заданьняў, як сельсаветы Шклоўшчыны? (1-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ (4-ая стар.).

ЗЬВЯРНУЦЬ ПЕРАХОДНЫ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

Рабочыя, калгасьнікі і перадавыя сяляне—працоўныя аднаасобнікі БССР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б дасягнулі ўжо значных посьпехаў у справе выкананьня фінансавых задач будаўніцтва сацыялізму. Ужо на працягу году плян мабілізацыі сродкаў у агульных лічбах сыстэматычна выконваецца і перавыконваецца. Нядрэнныя агульныя вынікі ў галіне выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў мы маем і ў III квартале: агульны плян мабілізацыі сродкаў III-га кварталу выкананы па БССР на 102,9 проц., а з улікам самаабкладаньня на 108,8 пр.

Аднак, пры агульным перавыкананьні пляну мабілізацыі сродкаў па паасобных плацяжох мы маем яшчэ значнае недавыкананьне. Плян рэалізацыі пазыкі «заключнага году пяцігодкі» выкананы ўсяго на 73,5 проц., прычым выкананьне пляну ў асноўным праходзіць за кошт рэалізацыі па выкі сярод рабочых і служачых (95 проц.); калгасны сэктар вёскі выканаў толькі 67,3 проц., а аднаасобны—8,2 проц.; плян касавых паступленьняў па рэалізацыі пазыкі на вёсцы ў III квартале выкананы на 43,6 проц., па ўкладах у ашчадкасы—43,0 проц., па паявых узносах спажывецкай кааперацыі—79,5 проц.

Недавыкананьне пляну па гэтых плацяжох зьявілася прычынай таго, што ня гледзячы на агульнае перавыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў III кварталу пераходны чырвоны сьцяг калегіі НКФ СССР і ЦК Саюзу фінбанкаўскіх работнікаў, які за перамогі на фінансавым фронце да гэтага часу трымала БССР, перададзены зараз Адэскай вобласьці, якая ў III квартале перавыканала плян мабілізацыі сродкаў па горадзе і па вёсцы па ўсіх плацяжох, а так сама і заданьне па падатку са звароту.

На фоне перамогі Адэскай вобласьці, якой зараз ад БССР па праве пераходзіць вышэйшая ўзнагарода, гэтыя слабыя вучасткі нашай работы вызначаюцца асабліва яскрава. Мы навучыліся ўжо здавальняюча ацэньваць выкананьнем агульнага пляну: калі ў першым квартале пераходны чырвоны сьцяг быў заваяваны фактычна 12-цю раёнамі, якія значна перавыканалі свае пляны, дык у III-м квартале перавыканалі пляны мабілізацыі сродкаў ужо больш паловы раёнаў. Аднак, мы ня зжылі яшчэ абязьлічкі адносна паасобных плацяжоў; мы не навучыліся яшчэ з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за выкананьне фінансавага пляну па кожным плацяжу. Між тым кожны вучастак фінансавага пляну мае свае асобнае значэньне ў правядзеньні нашай фінансавай палітыкі і толькі ў тым выпадку, калі плян будзе поўнасьцю і своячасова выконвацца па кожным плацяжу, мы можам казаць аб строгім выкананьні фінансавага пляну, на пе абходнасьць чаго зазначаў яшчэ сьнежаньскі (1930 г.) пленум ЦК УсеКП(б).

Асноўнай прычынай недавыкананьня пляну па паказаных вучастках у III-м квартале было тое, што масавая работа вакол выкананьня пляну па гэтых плацяжох была разгорнута недастаткова і ня была ўвязана з іншымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі на вёсцы. Кіруючыя арганізацыі паасобных раёнаў гэтаму вучастку не аддалі належнай увагі, не забясьпечылі ўмацаваньня апарату ашчадных кас належнымі работнікамі, а ў паасобных выпадках яшчэ і зараз наглядаецца простае невыкананьне дырэктыў партыі аб неадрыве фінансавых работнікаў і работнікаў ашчадкас ад іх непасрэднай работы на фінансавым фронце.

Зараз мы ўступілі ў апошні, рашаючы квартал першай пяцігодкі. У гэтым квартале выкананьне пляну па кожным плацяжы асабліва важна. Гэтага патрабуюць ня толькі неадкладныя бягучыя патрэбы нашага будаўніцтва—забесьпячэньне своячасовай выплаты заработнай платы, разьліку за загатоўкі, але і асобнае месца IV-га кварталу, як парогу 2-й пяцігодкі.

Выключнае значэньне IV кварталу, страта пераходнага чырвонага сьцягу абавязваюць усю нашу грамадзкасьць і, у першую чаргу фінансава-крэдытны апарат, апарат ашчадкас, кожнага ўдарніка і актывіста фінансавага фронту на стойліва прыняцца за ліквідацыю маючыхся недахопаў.

Рабочыя заводу імя т. Варапылава ў сувязі з падыходзячым сьвятам XV-ці годзьдзя Кастрычніка вялі рэвалюцыі і стратай БССР вышэйшай узнагароды пры нялі на сябе рад сацыялістычных самаабавязацельстваў па выкананьні фінансавага пляну IV-га кварталу. Пралетары заводу імя Варапылава кожнаму прадпрыемству, кожнай арганізацыі і кожнай установе даюць прадметны ўрок бальшавіцкіх адносін да паасобных няўдач і недахопаў. Гэтаму прыкладу павінны пасьледаваць усе прадпрыемствы, калгасы, вёскі, арганізацыі і ўстановы.

Пройдзены ўжо намі пэрыяд барацьбы за поўнае выкананьне фінансавага пляну—пэрыяд бальшавіцкіх перамог і паасобных няўдач—вопыт Адэскай вобласьці, якая заваявала зараз пераходны чырвоны сьцяг з ўсёй яскравасьцю паказвае, што ўвесь «сакрэт» посьпехаў па фінансавым фронце—гэта шырока арганізаваная, сыстэматычная масавая работа.

Толькі пры ўмове мабілізацыі ўсіх грамадзкіх сіл—партыйных, камсамольскіх, прафэсійных арганізацый і ўсяе савецкай грамадзкасьці мы зможам выканаць адказнейшыя фінансавыя задачы апошняга кварталу першай пяцігодкі, дабіцца поўнага выкананьня пляну па кожным плацяжы і зьвярнуць пераходны чырвоны сьцяг.

Першы крок на гэтым шляху, першая дэкада кастрычніка дала яўна нездавальняючыя вынікі. Пры выкананьні квартальнага пляну па абавязковых плацяжох на 12,2 проц., плян дабраахвотных плацяжоў выкананы толькі на 4,1 проц., па рэалізацыі пазыкі на вёсцы за дэкаду паступіла толькі 3,7 проц., па паявых узносах вясковай сеткі спажывецкай кааперацыі—2,9 проц. квартальнага пляну; па касах ашчадкасьці наглядаецца адліў укладаў.

Неабходны неадкладны круты пералом. XV-годзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі мы павінны сустрэць з выкананьнем ня менш 50 проц. квартальнага пляну па ўсіх плацяжох, у прыватнасьці і асабліва на адстаючых вучастках—па рэалізацыі пазыкі на вёсцы, паявых узносах спажывецкай кааперацыі і укладах у ашчадкасы.

Абвешчаны на IV квартал шырокі агітмасавы паход за выкананьне фінансавага пляну павінен стаць сапраўдным масавым рухам мільёнаў працоўных за выкананьне фінансавых задач апошняга кварталу першай пяцігодкі, за зварот у БССР пераходнага чырвонага сьцягу. Забясьпечыць гэткі характар паходу — справа партыйных, камсамольскіх прафэсіянальных, іншых грамадзкіх арганізацый і, у першую чаргу, фінансава-крэдытнага апарату.

Папраўка

«У пастанове сакратарыяту ЦК ад 28 верасьня г. г. (№ 36, § 12) «Аб ходзе перабудовы партмасавай работы на прадпрыемствах» у п. п. 4 і 5 украліся тэхнічныя памылкі. Трэба чытаць гэтыя пункты ў наступнай рэдакцыі:

4. У цэнтр масавай работы паставіць пытаньне барацьбы за павышэньне тэмпаў выкананьня прамфінпляну (барацьба з прагуламі, бракам і прастоямі, рабочыя прапановы, зьніжэньне сабекошту, узьняцьце якасьці і г. д.), матар'яльна - бытавыя пытаньні (рабочае забясьпечаньне, разгляд рабочых скаргаў і г. д.) і аховы сацыялістычнай уласнасьці, узмацненьня пралетарскага кіраўніцтва вёскай (збожжазагатоўкі, шырэйшаму, калгасны гандаль, мясазагатоўкі), растлумачэньне вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва да XV гадавіны Кастрычніка і далейшага росту рэвалюцыйнага ўздыму ў краінах капіталізму.

Рашуча перасякаць усялякія элемэнты адміністраваньня ў масавай работе, шырэй практыкаваць мэтад аналягічны харчовым канфэрэнцыям, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на неаходнасьць яшчэ больш дакладнай падрыхтоўкі падсобных канфэрэнцый.

5. Канстатуючы паслабленьне, а па радзе прадпрыемстваў ліквідацыю жаночых дэлегацкіх сходаў, ЦК прапануе неадкладна правесьці выбары дэлегатак, там, дзе апошнія не выбіраліся, вылучыць у якасьці кіраўнікоў дэлегацкімі сходамі моцных партыйцаў. У масавай рабоце сярод жанчын асаблівую ўвагу аддаць пытаньням паляпшаньня работы ЗРК, заводзкай сталоўкі, стварэньню ўласнай харчовай базы і г. д.

Бульба—Ленінграду

ЧЫРВОНЫМІ ЭШАЛЕНАМІ БУЛЬБЫ—
АДКАЗАЦЬ НА ЛІСТ ЛЕНІНГРАДЗКІХ РАБОЧЫХ

З поля на станцыю,—як працуе калгас „Ударнік“— павінны працаваць усе калгасы БССР

ЗВОДКА
аб адгрузцы бульбы на 15 кастрычніка 1932 г. (у тонах)

АРГАНІЗАЦЫІ	Плян	Адгружана: За дзень	Адгружана: З пачат. кампаніі	Проц. выкананьня
Белкаплодагародніна	125000	2142	42867	34,3
Белплодагародніна	66000	1025,4	14923,5	23,6
РАЗАМ	191000	3167,6	57790,5	30,3
Белкаплодагародніна:				
ЛСГТ	106000	2049	34799	32,8
Дар. ТСТ Кастрычніка	6000	—	1950	24,5
„ „ Мурм.	5500	14	2741	49,8
Белплодагародніна:				
ЛСГТ	27000	211,5	3204,1	11,6
«Ленінградгарт»	7200	14,7	2081,2	28,9

Здаюць бульбу звыш пляну

Улічваючы важнае значэньне здачы плодагародніны і бульбы дзяржаве, калгасы КРУКАВІЦКАГА сельсавету, МАЗЫРСКАГА раёну, на агульных сходах аднагалосна пастанавілі здаць дзяржаве лішкі бульбы і плодагародніны. Так, напрыклад, КАЛГАС ІМЯ МОЛАТАВА, які цалкам вызвалены ад загатовак, здаў 3,3 тоны капусты, 3,5 тоны бульбы, і інш. плодагародніны; калгас «ПЯЦІГОДКА» здаў 15 тон бульбы; калгас «ШЛЯХ САВЕТАЎ»—16 тон бульбы і звыш 8 тон капусты, моркві, буракоў. Калгасьнікі калгасаў Крукавіцкага сельсавету, здаючы лішкі плодагародніны, заклікаюць аднаасобнікаў свайго сельсавету і калгасы ўсяго раёну пасьледаваць іх прыкладу.

А. Ш.

Толькі 5,9 проц.

РАГАЧЭЎ. (Наш кар.). Рагачэўскі раён у гэтым годзе павінен загатовіць 12.000 тон бульбы. Асноўным яе загатоўцай зьяўляецца райспажыўсаюз, які павінен загатовіць 4.660 тон. Апрача гэтага, кантора Белплодгародніны і бліжэйшыя броварныя заводы таксама павінны разгарнуць работу па загатоўках для выкананьня пляну бульбазагатовак у 7.340 тон.

Між тым, сыстэматычнай растлумачальна - масавай работы вакол гэтага пытаньня сярод калгасьнікаў і бядняцка - серадняцкай часткі аднаасобнікаў—не праводзіцца, вынікам чаго зьяўляецца вялізарны прарыў на фронце бульбазагатовак. На сёньняшні дзень агульна-раённы плян загатоўкі бульбы выкананы толькі на 5,9 проц.—загатоўлена 713,8 тон. Асабліва ма рудна праводзяцца загатоўкі апаратам райспажсаюзу. Тут плян выкананы толькі на 6,4 проц. Работнікі райспажсаюзу, як і сам старшыня т. Рабоўскі, зусім ня цікавяцца становішчам бульбазагатовак у раёне.

Мясцовыя партячэйкі і сельсаветы таксама не надаюць гэтай важнейшай рабоце колькі-небудзь сур'ёзнага значэньня, прытрымліваючыся апартуністычнай тэорыі «чарговасьці» кампаній, ня ўвязваючы работу па збожжазагатоўках з загатоўкамі бульбы. Такімі сельсаветамі зьяўляюцца Куранскі, Званецкі ды інш., дзе бульбазагатоўкі праходзяць недапушчаль на марудна.

Асобныя калгасы раёну арганізавалі здачу (продаж) бульбы ў лік дзяржаўных загатовак непасрэдна з поля, разам з уборкай яе. Так робіць калгас «Ударнік», Ціхініцкага сельсавету, дзе гадавы плян загатовак бульбы выкананы на 77 проц. Калгас «Чырвоная Беларусь», Доўскага сельсавету гэтымі днямі арганізаваў чырвоны абоз, якім здана 4800 кг (300 пудоў) бульбы.

Для ліквідацыі прарываў у выкананьні ўсіх відаў загатовак РК КП(б)Б абвясьціў штурмавы дэкаднік. У вёску накіраваны партыйны, камсамольскі і прафсаюзны актыў горада.

Куляшоў Хв.

Фарсаваць тэмпы адгрузкі бульбы ў Ленінград

▲ КРУПКІ. Колькасьць бульбы, якую Крупшчына павінна адгрузіць у Ленінград, займае значнае месца ў агульна - рэспубліканскім пляне адгрузкі. Але ход адгрузкі абсалютна нездавальняючы. На 11 кастрычніка адгружана толькі 31 проц. пляну. Зусім недапушчальнае становішча з ходам выкананьня пляну аднаасобным сэктарам (выканалі толькі 20,5 проц. пляну) і з ходам спагнаньня цьвёрдых заданьняў—9,9 проц., ня гледзячы на тое, што капаньне бульбы па аднаасобным сэктары ўжо поўнасьцю скончана. Ніякай масавай работы сярод беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў не вядзецца. Сакратар Ухвальскай партячэйкі Вусік лічыць, што «без загібу цяжка дабіцца поўнага выкананьня заданьня». Такая наскрозь апартуністычная думка не атрымала ніякага адпору з боку партячэйкі і сельсавету. Бязьдзейнічаюць у адгрузцы бульбы Халопеніцкі, Грыцкаўскі, Слабодзкі і Шынкаўскі сельсаветы, якія выканаў заданьне па адгрузцы ў зусім нязначнай колькасьці.

▲ ВУЗДА. На 5 кастрычніка па раёне выбрана 78,5 проц., плошчы бульбы, а здана дзяржаве толькі 8 проц. пляну. Становішча не палепшылася і на 10 кастрычніка: выкананa 78,9 проц., здана 21 проц.

Аднаасобны сэктар, які заканчвае ўборку бульбы, выканаў плян загатовак толькі на 19,2 проц. Сельсаветы і партячэйкі гэтым пытаньнем не займаюцца.

▲ БАБРУЙСК. Загатоўка і адгрузка бульбы пралетарскім цэнтрам за апошнюю пяцідзёнку ня дала ніякага зруху. Плян адгрузкі бульбы Ленінграду на 14 кастрычніка выкананы толькі на 23,6 проц. Поўную бязьдзейнасьць праяўляюць Сіцькоўскі, Верасьнёўскі, Продзінскі, Харлапавіцкі, Багушэўскі і Капусьцінскі сельсаветы, якія выканалі плян загатовак бульбы ад 3 да 9 проц. Ніякай арганізацыйнай работы па загатоўках гэтыя сельсаветы не вядуць.

Не наладжана бесьперабойная дастаўка бульбы на прыстанцыйныя пункты. У глыбінках прыёмачныя пункты не забясьпечаны памяшканьнямі. У сувязі з апошняй пастановай ЦК і СНК БССР раённыя арганізацыі павінны забясьпечыць рашучы пералом.

Арганізуем калгасны кірмаш у Менску

Сакратарам Смалявіцкага, Заслаўскага, Дзяржынскага, Лагойскага, Плешчаніцкага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага райкомаў КП(б)Б

30-31 кастрычніка і 2 лістапада ў Менску прызначаецца міжраённы калгасны кірмаш, ЦК абавязвае забясьпечыць удзел усіх калгасаў, калгасьнікаў, працоўных аднаасобнікаў у гэтым кірмашы.

Начлегам і заежджымі дварамі кірмаш забясьпечан. Кірмаш адбудзецца на пляцы „Парыскай Камуны“.

Сакратар ЦК КП(б)Б РЫСКІН.

Пераходны чырвоны сьцяг перададзены Адэскай вобласьці

Пастанова калегіі Наркамфіну СССР і ЦК саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў

У сувязі з тым, што Адэская вобласьць пад кіраўніцтвам Адэскага аблвыканкому і партыйных органі ацый дамагалася буйнейшых посьпехаў на фінансавым фронце, перавыканаўшы плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва III кварталу па ўсіх асноўных дабраахвотных і абавязковых плацяжох, як па горадзе і па вёсцы, так і заданьня па падатку з абароту, калегія НКФ СССР і ЦК саюзу ФБР пастанаўляюць:

Перадаць пераходны чырвоны сьцяг цэнтральнага камітэту саюзу ФБР і калегіі НКФ СССР перадавой па выкананьні фінансавых заданьняў у III квартале Адэскай вобласьці, забраўшы яго ў БССР з прычыны якасна нездавальняючага выкананьня ёю і пляну мабілізацыі сродкаў, і пляну падаткаў з абароту па III квартале.

Нам. народнага камісара фінансаў СССР ЛЕВІН

Старшыня ЦК саюзу ФБР ЗАСЛАУСКІ

11 кастрычніка
1932 г.

Гадавы плян—да XV Кастрычніка

Ці так трэба змагацца
за спагнаньне цьвёрдых заданьняў як сельсаветы Шклоўшчыны?

Множыць прыклад працоўных аднаасобнікаў вёскі Мартынава

ЗВОДКА
аб ходзе збожжазагатовак на 15 кастрычніка
(у тонах і процантах)

	Спачатку кампаніі	За пяцідзёнку	Агульны проц. выкананьня
Калгасы МТС	5795	396	76,0
Іншыя калгасы	10100	549	57,1
Насенпазыка па калгасах	448	41	4,5
Кантрактанты	4316	470	—
Некантрактанты	7076	620	—
Цьвёрдае заданьне	2450	152	—
Насенпазыка па аднаасобным сэктары	43	-	7,7
Разам па БССР:	30670	2228	36,5

УВАГА. Агульны процант выкананьня збожжазагатовак па БССР даецца разам з насенпазыкай.

Зьлёт ударнікаў збожжазагатовак

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Па ініцыятыве раённай конкурснай камісіі, 9-га кастрычніка быў скліканы зьлёт лепшых ударнікаў збожжазагатовак — калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў - кантрактантаў трох перадавых вядучых сельсаветаў раёну: Смаліцкага, Бялевіцкага і Чапліцкага. На зьлёце прысутнічала каля 75 чалавек лепшых ударнікаў конкурсу па збожжазагатоўках.

На зьлёце раённая конкурсная камісія прэміявала лепшых здатчыкаў збожжа. Усяго выдана прэмій на 1900 руб. (Белта).

Працоўныя аднаасобнікі адказваюць на ліст ленінградзкіх рабочых

ДРЫССА. Аднаасобнікі вёскі Мартынава, Жоўнінскага сельсавету, у адказ на ліст ленінградзкіх рабочых поўнасьцю выканалі сваё заданьні па загатоўках збожжа і бульбы, а таксама ўнесьлі ўсе фінансавыя плацяжы IУ-га кварталу.

Праз райгазэту мартынаўцы выклікалі на сацспаборніцтва ўсіх працоўных аднаасобнікаў раёну. У адстаючую вёску ПОЛЬЗІНА, Жоўнінскага сельсавету, накіравана буксірная брыгада з працоўных аднаасобнікаў вёскі МАРТЫНАВА. У выніку праведзенай там масавай работы працоўныя аднаасобнікі вёскі Пользіна прынялі на сябе самаабавязацельства да 20-га кастрычніка выканаць пляны збожжа-і бульбазагатовак і да дня XУ гадавіны Кастрычніка ўнесьці ўсе абавязковыя плацяжы IУ кварталу. (Белта).

Зламаць кулацкі саботаж

РАГАЧЭЎ. (Ад нашага кар.). Кулацка-заможныя гаспадаркі раёну, якія ў гэтым годзе павінны ў парадку цьвёрдых заданьняў здаць дзяржаве 1820 цнт. збожжа, усімі мерамі імкнуцца сарваць збожжазагатоўкі, ухіляюцца ад выкананьня цьвёрдых заданьняў. Яркім прыкладам у гэтых адносінах можа служыць *Забалоцкі* савет.

Цьвёрдазадальнікі — заможнікі *Забалоцкага* сельсавету павінны здаць дзяржаве 132 цнт. збожжа. На справе яны здалі толькі 21,46 цнт. Заможнік *Яўменаў Яўстрат* да гэтага часу ня здаў ні аднаго пуда збожжа, маючы цьвёрдае заданьне ў 8 цнт. Заможнік *Грыцкоў і Блінцоў І.* таксама адкрыта сабатуюць збожжазагатоўкі; кожны з іх павінен здаць па 2 цнт. збожжа, а між тым не здана ніводнага кілё. Такіх зрыўшчыкаў загатовак у Забалоцкім сельсавеце ёсьць шмат. Аднак, ні партячэйка, ні сельсавет нічога не зрабілі для таго, каб забясьпечыць палкам і ў тэрмін выкананьне збожжазагатовак кулакамі і заможнікамі. Належнага націску на цьвёрдазадальнікаў няма.

З такімі фактамі можна спаткацца ў *Побалаўскім, Малаўстралкоўскім, Дварэцкім і Доўскім сельсаветах.*

Усё гэта гаворыць аб неабходнасьці ўзмацненьня націску на кулацка - заможныя гаспадаркі, якія безадгаворачна абавязаны выконваць даведзеныя да іх цьвёрдыя заданьні.

К.

Недаацэньваюць аднаасобніка, шкадуюць кулака

ШКЛОЎ.

Аб зусім яскравых і чоткіх дырэктывах партыі і ўраду пра скарэньне збожжазагатовак да 15 студзеня 1933 г. у раёне забыліся. Аб чым гаворыць тэмпы выкананьня гадавога збожжазагатоўчага пляну?

На 10 кастрычніка гадавы плян збожжазагатовак па раёне выкананы ўсяго толькі на 25,1 проц. Рад сельсаветаў упарта працягваюць адставаньне. Самым ярым - наведвальнікам чорнай дошкі зьяўляецца Фашчаўскі сельсавет, які ўпарта ня выконвае сваёй пляну загатовак і на 1-Х дабіўся толькі 5,4 проц. гадавога пляну. Тут сельсавет і партыйна-камсамольская арганізацыя не змаглі супроцьпаставіць сваю масавую работу «рабоце» кулацтва, які там шырока разгарнуў антызагатоўчую кампанію. Хатнік фашчаўскай хаты-чытальні замест разгортваньня масавай работы ў хаце-чытальні, ударыўся ў паніку. Ён заяўляе, што плян загатовак выканаць нельга, бо ў Фашчаўскім сельсавеце няма... масавай работы (?!)

Зарэчна-Шклоўскі сельсавет выканаў гадавы плян загатовак на 8,7 проц., а Таўкачоўскі на 9,5 проц. Гэта самыя адсталыя сельсаветы ў раёне. Яны ўпарта ня выконваюць сваіх пляноў. Што-ж робіць райком партыі, райвыконком? Ці паслалі яны ў гэтыя сельсаветы сваих работнікаў, з тым, каб шырока разгарнуць масавую работу, ушчэнт разьбіць кулацкую агітацыю? Так, паслалі, але-ж аб работе гэтых упаўнаважаных можна меркаваць па выкананьні пляну загатовак гэтымі сельсаветамі. Раз выкананьне нікчэмнае, вывад зразумелы—упаўнаважаныя праявілі абсалютную бязьдзейнасьць, яны абмяжаваліся толькі тым, што выехалі ў сельсаветы.

Акунёўскі і Нічыпараўскі седьсаветы не арганізавалі збожжазагатовак у аднаасобным сэктары, не разгарнулі масавай работы, у выніку чаго першы выканаў плян загатовак на 4,8 проц., а другі на 8,2 проц. Старшыні сельсаветаў і актыў тут праяўляюць паўнейшую апартуністычную недаацэньку аднаасобнага сэктару, чым зрываюць загатоўкі. Мізэрнае выкананьне збожжазагатовак аднаасобным сэктарам пацьвярджаюць факты, якія былі зьмешчаны ў «Сав. Бел.» у канцы верасьня аб масавай рабоце з беднатой. Беднота ў раёне не арганізавана, з ёй не ядуць ніякай работы. «Раён» нал газэта «Прамень Камунізму» за 10 месяцаў ніводным словам не абмовіўся аб рабоце з беднатой у раёне, гэта выпала з пад яе ўвагі.

У раёне значнае месца па загатоўках займаюць кулацка-заможныя гаспадаркі, якія павінны здаць 2044,53 цнтр. Замест таго, каб як мага мацней націснуць на кулака, прымусіць яго выканаць сваё цьвёрдае заданьне, тут абмяжоўваюцца толькі пустой гаварыльняй, а на справе нічога не робяць, у выніку чаго кулакі з свайго заданьня выканалі толькі 17,6 проц. або 354,9 цнтр

Рад сельсаветаў, якія па-баявому арганізавалі перамогу ў калгасным сэктары, праяўляюць недапушчальную жаласьць да кулака. Так, Александрыйскі сельсавет—самы першы ў раёне па выкананьні збожжазагатовак (54,5 проц. гадовага пляну, з якіх калгасы 61 проц., аднаасобнікі 24,8 проц.) ніяк не дабіўся выкананьня цьвёрда заданьняў—яны з пляну ў 17,2 цнтр. выканалі толькі 0,47 цнтр. або 2,3 проц. пляну.

У раёне панае недаацэнька аднаасобнага сэктару, жаласьць да кулака.

Патрэбна рашучая перабудова работы. За натуральнае кулаку—прыцягнуць да адказнасьці.

Цім. Гарадзішчанскі

Кастрычніка (БЕЛТА)

Работу т-ва „ПН“ узняць на вышэйшую ступень

(З уступнай прамовы т. Чарвякова пры адкрыцьці III усебеларускага зьезду т-ва „ПН“)

III ўсебеларускі зьезд т-ва «ПН» сабраўся напярэдадні XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

ХУ гадавіну Кастрычніка мы сустракаем, уступіўшы ў апошні квартал 4-га заключнага году першай 5-ці гадкі; ХУ гадавіну Кастрычніка мы сустракаем з вялізарнейшымі посьпехамі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, у выніку чаго Савецкая Беларусь, як частка Савецкага Саюзу, канчаткова замацавалася на сацыялістычным шляху разьвіцьця (воклески).

Змагаючыся за індустрыялізацыю, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, БССР няўхільна і пасьпяхова вырашае задачы культурнага будаўніцтва, стварэньня пралетарскую па зьместе і нацыянальную па форме. Адзначаючы сёньня вялізарнейшыя посьпехі ў справе індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, БССР адзначае разам з гэтым вялізарнейшыя посьпехі і на фронце культурнага будаўніцтва.

Савецкая Беларусь ў мінулым краіна эканамічна занепалая, культурна-адсталая ператварылася ў перадавую краіну дыктатуры пралетарыяту, адну з гэтых частак, Савецкага Саюзу, якая з гонарам змагаецца за перамогу сацыялізму, якая знаходзіцца ў перадавых радах сярод іншых брацкіх рэспублік ў гэтай начэснай барацьбе. Гэтых посьпехаў Савецкая Беларусь дамаглася дзякуючы магутнай і сталай дапамозе з боку Саюзу ССР, на аснове непахіснага змаганьня за генэральную лінію партыі, у барацьбе за рашучае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, у барацьбе супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, супроць шавінізму іншых колераў.

Вялізарнае значэньне ў вырашэньні агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва адыгрывала задача хутчэйшай ліквідацыі няпісьменнасьці, ператварэньня БССР ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Вось чаму камуністычная партыя, рабочая клясa, савецкая ўлада, уся пралетарская грамадзкасьць БССР з першых-жа дзён існаваньня Савецкай Беларусі мабілізаваліся на вырашэньне гэтай важнейшай задачы, на вынішчэньне рэшткаў той ганебнай спадчыны, якая нам засталася ад панаваньня буржуазіі. Ворагі пралетарскай рэвалюцыі ў выглядзе нацыянал-дэмакратаў, як перадавога атраду гэтых ворагаў ў БССР, імкнуліся запрымаць тэмпы ліквідацыі няпісьменнасьці. Аднак, саветы і ўся пралетарская грамадзкасьць БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў рашучым змаганьні супроць клясавых ворагаў дамаглася вялізарных тэмпаў ў вырашэньні гэтых задач. Дзякуючы гэтаму БССР сустракае ХУ гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі, скончыўшы ў асноўным барацьбу з няпісьменнасьцю, калі значная колькасьць гарадоў і раёнаў ужо абвясьцілі сябе суцэльна пісьменнымі. Трэба падкрэсьліць, што вельмі значную ролю ў вырашэньні гэтых задач адыграла т-ва «ПН», якое зьяўляецца масавай арганізацыяй, мабілізуючай масы рабочых, калгасьнікаў, чырвонасьцяжнага настаўніцтва і ўсіх працоўных на дапамогу саветам і органам НК Асьветы ў іх рабоце.

Мы дамагліся вельмі значных посьпехаў дзякуючы самаадданай, гэроічнай барацьбе на культурным фронце дзесяткаў тысяч культармейцаў, дзякуючы актыўнай рабоце як т-ва «ПН» ў цэлым, так і яго нізавых ячэек на месцах.

Зусім зразумела, што мы зрабілі б няправільна, калі б хоць на хвіліну-два пусьцілі думку аб тым, што ў рабоце т-ва ёсьць толькі дабраякасныя паказьнікі. Наадварот. Мы абавязаны падкрэсьліць, што ў рабоце т-ва «ПН» ёсьць вельмі многа хібаў і недахопаў, як ў цэнтры, так і на мясцох. Але з гэтага вынікае толькі тое, што ў нашай крабне яшчэ шмат магчымасьцяй для паскарэньня тэмпаў барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, за культурны рост Савецкай Беларусі і што гэта ў значнай меры залежыць ад актыўнасьці мас, ад дабраякаснай работы арганізацый т-ва «ПН».

Наш зьезд пачынае сваю работу на рубяжы паміж 1-й і 2-й пяцігодкай. Краіна саветаў уступае ў другую пяцігодку,—у пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, мы ставім перад сабой задачу канчатковага зьнішчэньня рэшткаў капіталізму як ў эканоміцы, так і сьвядомасьці людзей.

Для кожнага з вас павінна быць зразумелым, што вырашэньне гэтых задач патрабуе яшчэ большага культурнага ўздыму савецкіх рэспублік, патрабуе далейшага разгорнваньня культурнага будаўніцтва, каб паскорыць хутчэйшае ператварэньне ўсіх працоўных на шай краіны ў актыўных і сьвядомых барацьбітоў за сацыялізм, за стварэньне бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Вось чаму, прымаючы пастанову аб 2-й пяцігодцы, XVII партканферэнцыя падкрэсьліла, што хутчэйшая ліквідацыя малапісьменнасьці і рэшткаў няпісьменнасьці зьяўляецца адной з складаных частак агульнай барацьбы за перамогу сацыялізму.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР далі канкрэтнае заданьне у выкананьне пастановы XVII ўсесаюзнай партканферэнцыі. Такім заданьнем зьяўляецца арганізацыя работа па ліквідацыі малапісьменнасьці сярод дарослага працоўнага насельніцтва БССР. Задача таварыства «ПН» заключаецца ў тым, каб мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць пад кіраўніцтвам кампартыі на вырашэньне гэтай канкрэтнай задачы культурнага будаўніцтва.

Нашы посьпехі на гэтым фронце за мінулы час павінны яшчэ больш узброіць нас для барацьбы за новыя больш складаныя, больш адказныя задачы. Наша работа павінна набыць масавы характар. Т-ва «ПН» выкананае ўскладзеныя на яго задачы, выкананае свае абавязкі толькі як арганізацыя шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства, працоўнай інтэлігенцыі. Вось чаму трэба, каб і ў далейшым асноўным апорным зьвяном т-ва зьяўлялася нізавая ячэйка на фабрыках і заводах, у саўгасах і калгасах і т. д.

Толькі абапіраючыся на гэтыя ячэйкі мы зможам пасьпяхова вырашыць задачы, якія стаяць перад намі. Разам з масамі, на чале мас, пад кіраўніцтвам кампартыі мы павінны ісьці наперад у барацьбе за далейшы культурны ўздым Савецкай Беларусі.

III ўсебеларускі зьезд т-ва «ПН» павінен разгарнуць самую жорсткую крытыку і самакрытыку для выкрыцьця адмоўных бакоў у нашай рабоце мы, павінны скарыстаць вопыт мінулага для таго, каб сваімі пастановамі ўзмацніць работу т-ва, узняць яе на вышэйшую ступень, садзейнічаць далейшай мабілізацыі пралетарскай прамадзкасьці на вырашэньне задач культурнай рэвалюцыі.

Адкрываючы III ўсебеларускі зьезд і перадаючы ў вашай асобе прывітаньне не ад імя Цэнтральнага выканаўчага камітэту Саветаў БССР, ад Цэнтральнага савету таварыства «ПН», ўсёй шматтысячнай арміі барацьбітоў на культурным фронце,—я хачу заклікаць вас да актыўнай работы, каб гэта работа садзейнічала пасьпяховаму выкананьню дырэктыў XVII партыйнай канферэнцыі, сакавікоўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб хутчэйшай ліквідацыі малапісьменнасьці і рэшткаў няпісьменнасьці, як важнейшай задачы ў справе барацьбы за сацыялізм.

Няхай жыве вясёлая работа за суцэльную пісьменнасьць!

Няхай жыве камуністычная партыя —кіраўнік у барацьбе за стварэньне бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва!

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Няхай жыве шматтысячная армія культармейцаў, змагароў за культурную рэвалюцыю пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі!

ТЭМПАМІ УДАРНЫХ БРЫГАД

Дундзікавай, Эліфа, Сьпявака, Брамбурга, Кухарава, Крамнёва і Шаўцова рыхтавацца да XV гадавіны Кастрычніка

БССР павінна ведаць сваіх герояў

Бабруйск. (Наш кар.). У адказ на заклік пралетараў гораду Леніна аб падрыхтоўцы да сустрэчы ХУ гадавіны Кастрычніка, рабочыя прадпрыемстваў гор. Бабруйску ўзялі на сябе цэлы рад канкрэтных абавязацельстваў у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за ўкараненьне гаспадарчага разьліку.

Сёньня ўжо можна падвесьці першыя вынікі выкананьня ўзятых абавязацельстваў. Напрыклад, фанэрны завод № 16 можа ганарыцца работай брыгад *Дундзікавай, Эліфа* і *Сьпевака.* Гэтыя брыгады паказваюць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы, змагаючыся за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Брыгада Клейшчыц на чале з брыгадзірам тав. *Дундзікавай* з гонарам спраўляецца з узятымі на сябе абавязацельствамі. Сьвядомыя адносіны да работы, імкненьне недапусьціць прарываў,—стала асновай усёй работы брыгады. Сярод рабочых брыгады шырока распарнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Брыгада дабілася поўнай ліквідацыі прагулаў. У адказ на заклік ленінградцаў, яна дала абяцаньне да ХУ гадавіны Кастрычніка цалкам выканаць гадавы прамфінплян. Для гэтага трэба штодзённа выконваць плян на 125 проц. Трэба сказаць, што з выкананьнем гэтай задачы брыгада цалкам спраўляецца.

Брыгада тав. *Эліфа*, якая вырабляе нажовую фанэру па бальшавіцку змагаецца за выкананьне прамфінпляну. Сваёй ударнай работай яна паказвае, што ўзятыя ёю абавязацельствы будуць на заклік палкам выканаты. Гэта відаць з таго, што амаль штодзённа прамфінплян выконваецца на 135-145 проц. Разгорнута бальшавіцкая барацьба за палепшаньне якасьці прадукцыі.

Не адстае і брыгада лушільнага цэху. На чале з брыгадзірам тав. *Сьпіваковай* яна падыходзіць да кастрычніцкіх сьвят з перамогай у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Вельмі добра працуюць брыгады Саюзтрансу машын №№ 63, 64 і 65. Гэтыя брыгады сваёй бальшавіцкай работай сустракаюць ХУ Кастрычнік высокімі паказьнікамі выкананьня прамфінпляну. Машына № 63, на якой працуе шофэр *Кухараў*, выконвае прамфінплян штодзённа на 125-118-110 проц.

Такія першыя паказьнікі работы асобных брыгад па выкананьні ўзятых самаабавязацельстваў напярэдадні ХУ гадавіны Кастрычніка. Работу гэтых брыгад і іх вопыт трэба зрабіць адабыткам усіх прадпрыемстваў Бабруйску.

Аб бальшавіцкіх тэмпах работы брыгад Дундзікавай, Эліфа, Сьпевака, Брамбурга, Кухарава, Крамнёва і Шаўцова павінны ведаць усе працоўныя БССР, каб раўняцца па іх у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Дамброўскі.

У барацьбе за пераходны сьцяг ЦК КП(б)Б

ГОМЕЛЬ (БЕЛТА). Заводы «Пралетары» і «Палесдрук» уключыліся ва Ўсебеларускую вытворчую пераклічку. Апэрацыйныя пляны і праграмы даведзены да кожнай брыгады і рабочага. Заводы абвясьцілі ўнутрызаводзкую пераклічку і конкурс паміж цэхамі. У выніку гэтага дасягнута поўнае выкананьне прамфінпляну за першую дэкаду кастрычніка. Створаны новыя гаспадарча-разьліковыя брыгады

Да XV гадавіны Кастрычніка ліквідаваць запазычанасьць

БАБРУЙСК. Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат уступіў у чацьверты квартал першай пяцігодкі з вялікай запазычанасьцю.

Белцэх праграму III кварталу выканаў на 91,83 проц., лесацэх на 78,1 пр. (па экспарце на 105,6 проц.), стандартны цэх—на 63 проц., пільня № 6—на 98,1 проц. і пільня № 7—на 72,2 пр.

Гэтыя лічбы гавораць за тое, што ўсе цэхі камбінату выйшлі з вялікім пасьпяхам балянсам у выкананьні вытворчай праграмы III кварталу.

У чым асноўная прычына ганебных прарываў?

Яна заключаецца ў тым, што, як і раней, наглядаецца няўменьне з боку гаспадарнікаў, парт. і прафсаюзных арганізацый па новаму працаваць, няўменьне ўвязваць задачы вытворчасьці з асноўнымі бягучымі задачамі дня, няўменьне ў сваёй штодзённай практычнай рабоце ажыцьцяўляць 6 умоў тав. Сталіна.

У асноўных цэхах камбінату (лесцэх) на сёньнішні дзень маецца вялікі процант недавыкананьня прамфінпляну выключна з прычыны недахопу рабочых.

Што зроблена прыкупнікам лесцэху для таго, каб забясьпечыць цэх рабочай сілай, каб замацаваць кадры, якія маюцца? Нічога.

Сталоўка не пабудавана, у інтэрнатах брудна. Харчаваньне не пастаўлена на належную вышыню. Бываюць выпадкі, калі сталовая адпускае абеды бяз хлеба.

Партком абгаварваў і правяраў выкананьне рашэньняў харчовай канферэнцыі, даўшы дырэктыву завкому. Але апошні нічога не зрабіў для таго, каб выканаць гэтую дырэктыву.

Самбытавы сэктар завкому, які ў гэты час павінен быў працаваць з асаблівай напружанасьцю,—сядзіць і нічога не робіць.

Ня гледзячы на неаднаразовыя патрабаваньні з боку шматтыражкі аб адчыненьні шавецка-рамонтнай майстэрні—апошняя і да гэтага часу не адчынена.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў заміпадзе. У цэхах няма ніводнай спраўднай сацтаваразьліковай брыгады.

Калектыў рабочых камбінату павінен па бальшавіцку ўзяцца за паскарэньне прарыву мінулага кварталу і поўнае выкананьне плану чацьвертага кварталу. Гэтаму абавязаюць, узятымі намі абавязацельствы ў адказ на ліст ленінградзкіх рабочых.

Камбінат — волат дрэваапрацоўчай прамысловасьці БССР—ня можа стаяць у апошніх радох па выкананьні прамфінпляну. Ён павінен ісьці ўперадзе.

Задача рабочага калектыву камбінату—у бліжэйшы час дабіцца пералому.

С. Каган.

Рабочыя фабрыкі „Спартак“ рыхтуюцца да ХУ Кастрычніка

Зьлёт ударнікаў Шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» у адказ на ліст ленінградзкіх рабочых узяў на сябе выкананьне цэлага раду практычных мерапрыемстваў.

Для лепшай падрыхтоўкі да 15 гадавіны Кастрычніка выпрацаваны мар шруты (іх восем) па брыгадах і цэхах, якія праводзяць падрыхтоўчую работу да Кастрычніка.

Так, маршрут па ліквідацыі ўсіх недахопаў на вытворчасьці, барацьба за выкананьне прамфінпляну ўзяла першая брыгада вытворчага цэху.

Маршрут па палепшаньні бытавых умоў рабочых будзе распрацоўваць пакамэра і ІТР.

У адказ на ліст ленінградзкіх рабочых спартакаўцы абавязуюцца: кожнаму ўдарніку ўнесьці ня менш як адну рацыяналізатарскую прапанову, ахапіць усіх рабочых пасобку і цэхі прадпрыемства сацспаборніцтвам, арганізаваць 3 гаспразьліковыя брыгады імя XV гадавіны Кастрычніка і рад іншых абавязацельстваў.

Мік. Мядзьведзяў.

Пастанова калегіі Народнага камісарыяту фінансаў і ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў БССР

Фінансава-крэдытны апарат і армія ўдарнікаў фінансавага фронту БССР, дабіўшыся і ў III-м квартале перавыканаўшыя агульнага пляну мабілізацыі сродкаў (102,9 проц.), а ў улікам самаабкладаньня 108,8 ня выканалі, аднак, дырэктыў партыі і ўраду аб разгортваньні шырокай масавай работы па забясьпечаньні выкананьня пляну па ўсіх плацяжох: недавыкананы плян касавых паступленьняў па рэалізацыі пазыкі на вёсцы (43,6 проц.), укладах у ашчадкасы (43,0 проц.), паявых узносах па вясковай сетцы спажывецкай кааперацыі (79,0) і заданьне па плацяжох аграмаджанага сэктару (86,1 проц.). Большасьцю раёнаў перавыканалі агульны плян мабілізацыі сродкаў III-га кварталу; аднак, і па гэтых перадавых раёнах маецца і недавыкананьне пляну дабраахвотных плацяжоў.

Адзначаныя недахопы былі прычынай таго, што пераходны чырвоны сьцяг калегіі Народнага Камісар'яту Фінансаў СССР і ЦК саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў, якім БССР была ўзнагароджана ў 1 квартале бягучага году пастановаю калегіі Наркамфіну Саюзу і ЦК саюзу ФБР перададзен зараз перадавой, перавыканаўшай у III-м квартале плян мабілізацыі сродкаў па ўсіх плацяжох і заданьне па падатку са звароту—Адэскай вобласьці.

Утрата пераходнага чырвонага сьцягу асабліва падкрэсьлівае слабасьць нашай работы на паасобных вучастках, а вопыт Адэскай вобласьці, якая па праву атрымоўвае зараз вышэйшую узнагароду, яшчэ раз паказвае, што маецца поўная магчымасьць выкананьня і перавыкананьня пляну па кожным плацяжу ў паасобку.

Калегія Народнага Камісарыяту Фінансаў і ЦП саюзу ФБР БССР заклікаюць фінансава-крэдытны апарат, апарат ашчадных кас, кожнага ўдарніка і актывіста фінансавага фронту паасобку і ўсю савецкую грамадзкасьць гарадоў, раёнаў, сельсаветаў, прадпрыемстваў, калгасаў і вёсак БССР у IV квартале пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый разгарнуць шырачэзную масавую работу за якаснае выкананьне фінансавага пляну з тым, каб у IV квартале зноў заваяваць утрачаную зараз ганаровую ўзнагароду.

Перадавікі ня маюць права мець паасобныя недахопы. Каб заваяваць ізноў першынства на фінансавым фронце—усе зьвяны фінансава крэдытнага апарату ашчадкас з бальшавіцкай настойлівасьцю павінны ўзяцца за ліквідацыю недахопаў, якія маюцца, асабліва адставаньня ў справе рэалізацыі пазыкі на вёсцы і прыцягненьня ўкладаў у ашчадкасы.

За выкананьне ня менш 50 проц. квартальнага пляну да дня XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

За датэрміновае выкананьне пляну апошняга кварталу заключнага году пяцігодкі на ўсіх вучастках і па ўсіх плацяжох.

За зварот у БССР у IV-м квартале пераходнага чырвонага сьцягу.

Нам. Наркома Фінансаў БССР
М. АБРАМСОН.

ЦП Саюзу ФБР БССР
ГЕРАЎКЕР.

16 кастрычніка 1932 г.
Менск.

Бальшавіцкія самаабавязацельствы рабочых „Дзьвіна 4“

ВІЦЕБСК. Рабочыя групы Віцебскага цэху фабрыкі «Дзьвіна» у адказ на заклік ленінградзкіх рабочых і рабочых заводу «Бальшавік» уключыліся ва Ўсебеларускую пераклічку фабрык і заводаў на лепшую падрыхтоўку да XV-й гадавіны Кастрычніка, ўзялі ўшы на сябе рад самаабавязацельстваў:

Дабіцца рашучага палепшаньня якасьці прадукцыі, зьмяншыўшы асноўнае зло цэху—недамоты і перамоты. Поўнасьцю выканаць і перавыканаць прамфінплян за кастрычнік, даючы штодзённа 275 зьмены замест 269. Поўнасьцю ліквідаваць прагулы і спазьненьні па няўважлівых прычынах. Ахапіць ударніцтвам усіх рабочых цэху. Паказаць гэроям пяцігодкі — лепшых ударнікаў цэху. Рабочыя цэху абавязваюць даць ня менш 10 рацыяналізатарскіх прапаноў. Бліжэйшыя свае выходныя дні поўнасьцю скарыстаць для ўборкі гародніны ў прыгарадным гаспадарцы.

Рабочыя матальнага цэху выклікалі на сацспаборніцтва па падрыхтоўцы да сьвята рабочых групы «А» і «Б» матальнага цэху.

(БЕЛТА).

Без затрымак рэалізаваць вынаходзтва

Вынаходзтва на дарожным будаўніцтве, якое мае надзвычай вялікае значэньне, пакуль што разгорнута слаба. Аднак, у масах закладзена вялікае імкненьне да новых удасканаленьняў перавозачных сродкаў, мэтадаў работы і ў прыватнасьці аўтамашын.

Шофэр аўтакалёны 4 атраду тав. Курс вынайшоў варонку (фільтар), пры дапамозе якой у часе наліўкі ў бак бэнзіна адфільтроўваецца ад сьмецьця, вады і ў некалькі раз паскараецца наліўка. Вынаходзтва дае каля 400—500 руб. эканоміі ў год на кожную машыну.

Даведаўшыся аб гэтай вынаходцы, намесьнік старшыні Беларускага Бюро вынаходзтва прыслаў адносіну начальніку аўтаатраду № 4 аб тым, каб ён адпусьціў шофэра Курса ў Віцебск для рэалізацыі вынайдзенай варонкі.

Адсюль і пачынаецца бюрадзкая бюракратычная цягаціна. Курс аддае варонку намесьніку старшыні Бюро Цугасаву, але той у Менск яе не адаслаў. Пасьля гэтага Курс перадае сваю вынаходку ў Галоўдарправе для бюро рамонту, але і тут яна праляжала некалькі месяцаў без якога-небудзь адказу.

Рабочыя абураны безадказнымі адносінамі да вынаходкі тав. Курса і патрабуюць ад Галоўдарпрансу неадкладнай рэалізацыі каштоўнай прапановы.

КАПЕЛЬНІК.

Праца легкай прамысловасьці за тры кварталы 1932 г.

Ліквідаваць ганебнае адставаньне

Ня гледзячы на тое, што лёгкая прамысловасьць БССР мае вялікія даасягненьні ў выкананьні пляну ў параўнаньні з яго выкананьнем за 9 месяцаў 1931 г., усё-ж плян за тры кварталы 1932 году выканан толькі на 83,1.

Гэтая лічба гаворыць аб тым, што барацьба за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна—за бальшавіцкі адказ на адозву пралетараў гораду Леніна на прадпрыемствах Наркамату Лёгкай прамысловасьці БССР паслабла, што рух энтузіязму і сацспаборніцтва, не накіраваны ў правільнае рэчышча, што ён ня мае належнага падпрыманьня з боку асобных партыйных, прафэсіянальных і гаспадарчых арганізацый.

Лічбы выкананьня прамфінпляну па прадпрыемствах лёгкай прамысловасьці гавораць аб тым, што ў III квартале мы мелі ганебнае зьнижэньне тэмпаў. Так, калі ў 1 квартале прамфінплян выкананы на 89,8 проц., у II квартале—98,8 проц., дык у III квартале процант выкананьня пляну зьнізіўся да 63,4 проц.

Асноўныя прычыны гэтага ганебнага прарыву ёсьць пасьлабленьне гаспадарчай, прафсаюзнай і партыйна-масавай работы, адсутнасьць канкрэтнага кіраўніцтва з боку партыйных, гаспадарчых, прафсаюзных арганізацый цэлага раду прадпрыемстваў.

Асноўным бічом, які моцна б'е па вытворчасьці,—гэта вялікая цякучасьць рабочай сілы. Лічбы, якія мы прыводзім, не патрабуюць каментарый. Яны таворыць самі за сябе. Так, за май па прадпрыемствах НКЛП было прынята на работу 1768 чал., а звольнілася—2715. У чэрвені было прынята 1548 чал., звольнілася—2310. У ліпені цякучасьць рабочай сілы дасягнула 4488 чал., а прынята было толькі 1597.

У чым корань зла, дае прычыны такой вялікай цякучасьці? У першую чаргу ў тым, што на нашых прадпрыемствах яшчэ не аддаецца належнай увагі рэалізацыі другой умовы тав. Сталіна аб тым, што «цяперашні рабочы хоча жыць з пакрыўцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных запатрабаваньняў».

Дырэктывы партыі і ўраду аб разгортваньні савецка-калгаснага гандлю і вырабу шырэйшаму адкрываюць ня бачныя магчымасьці ў палепшаньні рабочага забясьпечаньня шляхам самазагатовак. Між тым на цэлым радзе прадпрыемстваў мы наглядаем значнае пагоршаньне якасьці абедаў ў заводзкіх сталоўках. Калі некалькі месяцаў таму назад сталоўка заводу імя Варашылава і друкарні імя Сталіна маглі па праву ганарыцца якасьцю абедаў і арганізацыяй працы ў цэху харчаваньня, дык зараз на заводзе імя Варашылава якасьць абедаў знаў на пагоршылася. Амаль такое-ж становішча мы маем і ў сталоўцы друкарні імя Сталіна.

Тав. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў адзначыў: «цяпер цякучасьць рабочай сілы—значыць разлажыць нашу прамысловасьць, вынішчыць магчымасьць выкананьня вытворчых пляноў, падарваць магчымасьць палепшаньня якасьці прадукцыі». І як вынік вялікай цякучасьці, мы наглядаем значнае недавыкананьне пляну, пагоршаньне якасных паказьнікаў:

Рост прадукцыйнасьці працы праду гледжаны плянам на 18,6 проц. А ў сапраўднасьці ён складае толькі 4,4 проц. Прычым на прадпрыемствах НКЛП назіраецца яшчэ адзін недахоп, які адмоўна адбіваецца на сабекошце прадукцыі. Так, плянам 1932 году было прадугледжана павялічэньне заработнай платы на 6,3 проц. пры ўмове падвышэньня прадукцыйнасьці працы на 18,3 проц. А ў сапраўднасьці мы бачым, што рост заработнай платы дасягае 9,3 проц. пры падвышэньні прадукцыйнасьці працы толькі на 4,4 проц.

Гэты вялізарнейшы разрыў паміж ростам заработнай платы і прадукцыйнасьцю працы трэба ў першую чаргу тлумачыць дрэнна пастаўленай работай ТНБ і існуючай яшчэ ліквідацкай урэгуляцыі па радзе нашых прадпрыемстваў. На заводзе «Ударнік» рабочы, атрымліваючы нарад на выработ той ці іншай дэталі, ніколі адначасова не атрымлівае расцэнкі, бо ТНБ яшчэ яе ня вылічыла і абяцае даць расцэнку пазьней. Такім чынам большая частка расцэнак мотанаўляецца «на вока». Гэта прыводзіць да таго, што сьлесар, які працуе на кваліфікаванай радзе з прычыны дрэннай работы ТНБ зарабляе менш, чым чорнарабочы або сьлесар меншай кваліфікацыі, якім майстар устанавіў расцэнку на-вока. На швейных фабрыках «Акцябр» і імя Дзяржынскага мы наглядаем факты, калі чорнарабочы атрымлівае 5-6 руб. у дзень, а кваліфікаваны краўец толькі 3-4 руб.

Яшчэ адной прычынай разрыву паміж ростам прадукцыйнасьці працы і заработнай платы трэба лічыць дрэннае плянаваньне па паасобных прадпрыемствах, няўвязку працы паміж цэхамі і г. д. На заводзе імя Варашылава мы назіралі такі факт, калі токар 5-га разраду папрацаваў больш 4 гадзін, каб знайсьці патрэбныя для работы дэталі. А плянавы аддзел цэху не падкажаўся, каб забясьпечыць дастаўку паўфабрыкату да варштату. Такое-ж становішча мы наглядаем амаль ва ўсіх прадпрыемствах лёгкай прамысловасьці БССР. Наглядаюцца выпадкі (майстэрня Белбудаб'яднаньня), калі рабочыя прыходзяць на работу і вымушаны чакаць гадзіну і больш пакуль майстар выдасьць ім работу. Па паасобных прадпрыемствах наркамату лёгкай прамысловасьці часта парушаецца выпрацаваны графік. Гэта вядзе да дэзарганізацыі рабочых у часе работы, да ломкі прамфінпляну, да немагчымасьці шырока карыстацца высоўваньнем сустрэчных пляноў. Кіраўніцтва фабрыкамі і заводамі з боку кіраўнікоў адзіданьняў таксама недастаткова добрае. У большай частцы яно зводзіцца да кіраўніцтва абежнікамі, а жывое, канкрэтна-апэрацыйнае кіраўніцтва адчуваецца вельмі слаба.

Таксама адбіваецца на выкананьні прамфінпляну частая зьмена дырэктароў, што наглядаецца на нашых прадпрыемствах. Калі ўзяць завод імя Варашылава, дык там за апошнія два гады зьмяняліся 3 дырэктары і 3 намесьнікі. На абутковай фабрыцы мы наглядаем амаль такое-ж становішча. Асабліва часта на прадпрыемствах зьмяняюцца намесьнікі дырэктароў па БРИЗ'у і рацыяналізацыі, што бязумоўна не дае магчымасьці адладзіць тэхнікай вытворчасьці і канкрэтна ім раваць прадпрыемствам.

Адсутнасьць чоткага плянаваньня, выразнага кіраўніцтва прыводзіць да вялікіх прастояў на нашых прадпрыемствах. Досыць адзначыць, што колькасьць прастояў па прадпрыемствах НКЛП за 9 месяцаў складае 139.244 чалавекадні або 2,09 проц. да агульнага ліку рабочага часу. Трэба дадаць, што за 9 месяцаў 1932 году колькасьць прастояў павялічылася амаль у два разы. Калі за 8 месяцаў 1931 году прастоі складалі 1,34 проц. агульнага рабочага часу, дык зараз яны складаюць 2,09 проц. гэта лічба сыгналізуе аб тым, што справа плянаваньня бесьперапыннай работы нашых прадпрыемстваў значна пагоршылася.

Значыць, няўменьне чотка кіраваць вытворчасьцю, няўменьне добра плянаваць работу, няўменьне і нежаданьне змагацца за поўную рэалізацыю шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна, паслабленьне партыйна-масавай работы прывяло да таго, што за 8 месяцаў 1932 году на прадпрыемствах лёгкай прамысловасьці штодзённа не працавалі 650 чал. Але гэтая лічба да лёка няпоўная. Калі ў гэтую лічбу ўключыць колькасьць прагулаў па няўважлівых прычынах, дык стане зусім зразумелым, што належнай барацьбы за заахвочваньне ў падвышэньні прадукцыйнасьці працы, за максымальнае ўпчыльненьне рабочага дня няма.

Біч вытворчасьці—прагулы,—па паасобных прадпрыемствах НКЛП за 8 месяцаў гэтага году павялічыліся. Так, за 8 месяцаў 1931 году прагулы па няўважлівых прычынах складалі 0,76 проц. рабочага часу, за 8 месяцаў 1932 году гэты процант павялічыўся да 0,95. Такім чынам прагулы па няўважлівых прычынах на прадпрыемствах НКЛП складаюць 63.259 чалавекадзён. Асабліва вялікія прагулы назіраюцца па швейнай і тэкстыльнай прамысловасьці. 12.053 чалавека-дзён, што складаюць прагулы на прадпрыемствах тэкстыльнай прамысловасьці—вынік слабай масава-растлумачальнай работы. 12.053 страчаных чалавека-дзён—досыць моцнае і правільнае абвінавачваньне трыкутнікаў тэкстыльных прадпрыемстваў ў тым, што яны пасьля бялі работу па мабілізацыі мас на рэалізацыю шасьці пераможных умоў тав. Сталіна, у тым, што яны не ўзьнялі як належыць барацьбу за палепшаньне рабочага забясьпечаньня, за палепшаньне матар'яльна-бытавых умоў.

Яшчэ адна надзвычайна важная прычына, якая прывяла да ганебнага прарыву ў выкананьні пляну III кварталу,—ёсьць няўважлівыя адносіны і спадзяваньне на самацёк у пытаньнях прадастаўленьня чарговага адпачынку рабочым нашых прадпрыемстваў.

— «Усёроўна адпачынак трэба прадаставіць, дык няхай ідуць калі хочуць»—вось тыповае разважаньне апартуністаў, гора-гаспадарнікаў. Такія разважаньні прывялі да таго, што най большая колькасьць адпачынкаў, а адсюль і прастояў, прыпадае на III квартал. Гэта таксама сьведчыць аб тым, што дырэктывы аб прадастаўленьні адпачынкаў на працягу кругла-га году ня выконваюцца.

Яшчэ адна характарная лічба, якая дазваляе з усёй упэўненасьцю заявіць, што ў III квартале па прадпрыемствах лёгкай прамысловасьці паслабілі барацьбу за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна, паслабілі масава-выхаваўчую работу, што ў III квартале ў большасьці прадпрыемстваў НКЛП ня здолелі перабудаваць работу так, як гэта патрабуе сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва. У першым паўгодзьдзі 1932 году мы мелі прырост прадукцыі ў параўнаньні з першым паўгодзьдзем 1931 году на 32 проц. Між тым, за тры кварталы 1932 году мы маем прырост прадукцыі толькі на 8 проц. у параўнаньні з трыма кварталамі 1931 году. Гэта з усёй сур'ёзнасьцю ставіць перад усімі партыйнымі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі важнейшую задачу—неадкладна павярнуцца тварам да вытворчасьці, вывучыць і зьнішчыць тыя недахопы, якія перашкаджаюць разгортваньню бальшавіцкай барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

Асобна трэба спыніцца і гэта надзвычайна цікава, на запалкавай фабрыцы «Пралетарская Перамога», якая ў першым паўгодзьдзі яшчэ перадае ў выкананьні прамфінпляну, а ў III квартале значна зьнізіла тэмпы.

Пасьля цэлай паласы прарываў амаль на працягу двух гадоў новае кіраўніцтва фабрыкі сумесна з партыйнымі, прафсаюзнымі арганізацыямі здолела правільна расставіць сілы, забясьпечыць усе вытворчыя вучасткі партыйным уплывам, павялічыць колькасьць гаспадарча-разьліковых брыгад, яшчэ шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва і на гэтай аснове дамагчыся ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня прамфінпляну. У пачатку III кварталу фабрыка была опынена для рамонту з тым, каб перавесьці выраб прадукцыі выключна на экспарт. Аднак, пасьля скончэньня рамонту кіраўніцтва фабрыкі, заспакойўшыся на дасягнутых посьпехах атрымаўшы «галавакружэньне ад посьпехаў», паслабіла мабілізацыю мас на выкананьне пляну, спадзяючыся на самацёк.

Вынікі ня прымусілі сябе доўга чакаць. Некалькі дзесяткаў гаспразьліковых брыгад разваліліся, толькі за верасень ам-ц прагулы па няўважлівых прычынах дасягнулі 494 чалавека-дзён. На фабрыцы ўжо наглядаюцца выпадкі, калі асобныя ўдарнікі адмаўляюцца браць карткі ўдарнікаў, заяўляючы, што яны ўсё роўна ніякіх пераваг не даюць. Рабочае забясьпечань не пагоршылася, сталоўка пачала працаваць дрэнна, цякучасьць рабочай сілы павялічылася. Вынікам «галавакружэньня ад посьпехаў» зьявілася тое, што прамфінплян за III квартал выканан толькі на 79,5 проц.

За 9 месяцаў 1932 году лёгкая прамысловасьць БССР не дадала дзяржаве прадукцыі на суму 46.089 тыс. руб. Гэты прарыў—вынік паслабленьня партыйна-масавай работы, паслабленьня адказнасьці за даручаную работу з боку асобных гаспадарнікаў, вынік паслабленьня барацьбы за палепшаньне матар'яльнага становішча рабочых, няўменьня і нежаданьня перабудаваць сваю работу так, каб кіраваць і працаваць па-новаму.

За апошні час у работе нашай прамысловасьці наглядаецца паслабленьне барацьбы за аўладаньне тэхнікай, за канкрэтнае вывучэньне ўсіх вытворчых вучасткаў нашых прадпрыемстваў, за аўладаньне ўсімі працэсамі вытворчасьці. Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадар

Падхапіць ініцыятыву Вуцёўскага сельсавету

Аб ходзе сіласаваньня кармоў

Зводка НКЗБ на 10 кастрычніка

	Плян	Засіласавана	Проц. выкан	У тым ліку		
				саўгасы	калгасы	аднаасобнікі
На 5-X-32 г. было	1200000	3 7272	27,3	34,3	28,5	1,7
На 9-X 32 г. было		350000	29,2	38,4	30,2	1,7

Сіласаваньне кармоў уваходзіць за раз у апошнюю рашаючую фазу. Ад таго, як мы зможам мабілізаваць і расставіць сілы, як мы зможам выкарыстаць усе магчымасьці, залежыць посьпех выкананьня і перавыкананьня пляну сіласаваньня кармоў.

Ня гледзячы на позьні час, маюцца яшчэ вялізарныя запасы сілоснай сыравіны. У нас ёсьць значная плошча нескошанай атавы, маюцца вялікія запасы націнья гароднины, апаўшы лісьт і г. д. Калі не засіласаваць зялёную масу, пералічаныя вышэй кармы могуць бескарысна загінуць. Пад сьнег пойдуць дзесяткі тысяч тон спажыўных кармоў.

За апошнія дні ў паасобных раёнах разгортваецца масавая работа за выкананьне і перавыкананьне пляну сіласаваньня кармоў, каб да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі прыйсьці з поўнымі посьпехамі ў галіне стварэньня моцнай кармовай базы. Партыйныя, савецкія і земельна-калгасныя арганізацыі Церахоўшчыны, разгарнуўшы шырокую масавую работу вакол сіласаваньня кармоў, абавязваюцца да 25 кастрычніка выканаць і перавыканаць пляны. Распрацаваны практычныя мерапрыемствы па правільнай расстаноўцы сіл, уліку сілоснай сыравіны і г. д. Прыкладу Церахоўшчыны паўтарны пасьледваць усе адстаючыя раёны БССР.

Выкананьне гадавога пляну па сіласаваньні кармоў на 10 кастрычніка ў 29,2 проц. прымушае біць трывогу. Зводка НКЗБ па сіласаваньні кармоў сыгналізуе аб тым, што ў радзе раёнаў да апошняга часу яўна недаацэньваюць сіласаваньне кармоў. У той час, калі Арцэнішчына выканала гадавы плян на 107 проц., калі ёсьць паўны пералом у рабоце такіх раёнаў, як Полацкі, які выканаў плян сіласаваньня кармоў на 69,1 проц., Мсьціслаўскі (62,8 проц.), Віцебскі (56,5 пр.), Капыльскі (53,8 проц.). Рад раёнаў па апартуністычнаму адносінна да мерапрыемстваў па стварэньні моцнай кармовай базы. Чаго варта такая работа, калі Бешанковіцкі раён выканаў плян на 5,5 проц., Чырвонапольскі—8 проц., Лельчыцкі—9,2 проц., Рэчыцкі —9,9?

Засталіся лічаныя дні для правядзеньня сіласаваньня кармоў. Гэты кароткі час трэба максымальна выкарыстаць. Сельсаветы, дэпутацкія групы, партячэйкі, камсамол павінны неадкладна ўключыцца ў сілосны паход. Трэба па прыкладзе Церахоўшчыны ўзяць на вучот усю сілосную сыравіну, расставіць рабочую сілу, устанавіць адказнасьць за сіласаваньне кармоў.

Мы маем невычарпальныя запасы сілоснай сыравіны. Плян, вызначаны партыяй і ўрадам па сіласаваньні кармоў —зусім рэальны. Да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі мы павінны прыйсьці з выкананьнем і перавыкананьнем гэтага пляну

Дамо ня менш 3 тон сілосу на кожную галаву

Унечарровы пленум Вуцёўскага сельсавету (Церахоўскі раён) абгаварыўшы становішча кармовага балянсу па калгасах сельсавету, узяў на сябе абавязак з 25-га кастрычніка поўнасьцю пакрыць запазычанасьць па сілосе.

Пленум зьвярнуўся да ўсіх калгасьнікаў з наступным лістом:

— Мы пастанавілі,—гаворыцца ў лісьце,—загатовіць для апрамаджання гадавога: на карову—4 тоны сілосу, на нецель і пацёлка—3 тоны, на цяля —1 тону. А для неаграмаджанай жывёлы калгасьнікаў: на карову 3 тоны, на кожную авечку і дарослую сьвінню—1 тону, на падсьвінка—0,5 тоны.

Калгас «Бальшавік», які выканаў плян сіласаваньня ў 242 тоны на 80 проц., высунуў сустрэчны плян у 480 тон.

Адказнасьць за выкананьне пляну сіласаваньня па кожным калгасе мы ўскладаем на тых членаў сельсавету, на тых дэпутатаў і членаў сэкцый, якія жывуць на тэрыторыі гэтых калгасаў.

Мы ўстанаўліваем шэфства членаў сельсаветаў, дэпутатаў і членаў сэкцый па выкарыстаньні асобных расьлін, прыгодных на сілос.

Вылучаны 4 работнікі па сіласаваньні асакі, лугавой атавы, адкідаў гароднінства, крапівы і іншага пустазьля.

Мы заклікаем усіх калгасьнікаў, бедняцкую, серадняцкую - аднаасобнікаў БССР ўключыцца ў паход на стварэньні моцнай кармовай базы.

Таварышы! усе, як адзін, выйдзеце на барацьбу за сілос. Да XV гадавіны Кастрычніка дамо трэбне мільёны тон каштоўнага сакавітага корму. Гэтым мы забясьпечым павялічэньне малочнай прадукцыі Савецкай Беларусі на сотні тысяч тон, павялічым на дзесяткі тысяч тон выхад мяса і тлушчаў.

У нас маюцца вялікія рэсурсы сілоснай сыравіны, дзесяткі тысяч га нэўбранай атавы, вялізарныя запасы націнья гароднины і г. д.

Звычайна гэтыя кармовыя рэсурсы марна гінуць. Між тым калі іх засіласаваць,—яны забясьпечаць нашу жывёлу сакавітымі спажыўнымі бялковымі кармамі.

Мы прапануем пры кожным сельсавеце, пры кожным РВК склікаць унечарговыя пленумы для абгаварэньня становішча кармовага балянсу па сельсавеце і раёне і пераключыцца на баявую работу за поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну сіласаваньня.

Мы заклікаем усіх апратэхнічных работнікаў БССР выйсьці разам з намі ў сілосны паход, каб забясьпечыць штодзённае апратэхнічнае кіраўніцтва па закладцы зялёнай масы ў вежы, ямы, траншэі, капцы.

Ня можа быць гутаркі аб нерэальнасьці пляну, аб тым, што няма чаго сіласаваць. Сілоснай сыравінай мы забясьпечаны больш чым у выстарчальнай колькасьці.

Неабходна толькі мабілізаваць узрослую актыўнасьць рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў па скарыстаньні вялізарных запасаў зялёнай масы для сіласаваньня кармоў. Неабходна навучыць іх тэхніцы сіласаваньня.

Мы спадзяемся, што калі ўся савецкая грамадзкасьць мабілізуецца на гэтую важнейшую справу,—мы ня толькі ў самы кароткі тэрмін ліквідуем прарыў па сіласаваньні, але да XV гадавіны Кастрычніка прыйдзем з поўным выкананьнем і перавыкананьнем пляну сіласаваньня кармоў па кожным калгасе, саўгасе, па кожнаму сельсавеце.

Па даручэньні пленуму:

Старшыня Вуцёўскага с.-с. Кусінаў.
Сакратар Крывянкоў.

Сакратар камсамольскага калектыву і старшыня калгасу «Бальшавік» Мальцаў.

Старшыні калгасаў:
«Сьцепь»—Аўраменка.
«Варашылаў»—Міхалайчанка.
«Асоавіяхім»—Загаруеў.
«Высокі хутар»—Рак.
Аграном Маркаў.

Чавускаму райза пастанова ЦВК не закон

(Ліст калгасьніка)

Ня гледзячы на пастанову ЦВК СССР аб стварэньні ўстойлівага землякарыстаньня, ад калгасу «Ударнік палёў» (Асіпаўскі сельсавет, Чавускі раён) адрэзана 70 га зямлі пад саўгас «Камінтэрн». Некалькі разоў калгасьнікі зварочваліся ў Чавускі райза. Аднак, да гэтага часу справа ня ўладжана. Калгасьнікі ўжо езьдзілі 2 разы ў Менск у Наркамзем. Наркамзем прапанаваў Чавускаму райза неадкладна выехаць на месца і пакінуць калгасную зямлю за калгасам. Але райза ня хоча падпарадкавацца Наркамзему, у выніку ў калгасе сёлета атрымаўся недасеў жыта каля 30 га.

Па Асіпаўскім сельсавеце такіх фактаў шмат. Так, аднаасобнікі вёскі Асіпаўка ў колькасьці 18-ці гаспадарак ня маюць зямлі. Зямлю, якой карысталіся аднаасобнікі, таксама адрэзалі пад саўгас, у выніку чаго 18 гаспадарак аднаасобнікаў у гэту восень не засеялі ніводнага га жыта. Кулацтва выкарыстоўвае такія моманты і вядзе шалёную агітацыю.

Усё гэта робіцца на вачох Чавускага РК КП(б)Б, РКК РСІ, якія ўсё толькі абяцаюць калгасьнікам калгасу «Ударнік палёў»—«зробім» (?).

Патрэбна, каб ЦКК НК РСІ БССР сказала свае слова накопт гэтага ўпартага невыкананьня пастановы ЦВК СССР.

К. Ш.

Талачынскі нарсуд ня можа судзіць...

(Ліст рахункавода калгасу)

20 верасьня г. г. праўленьне калгасу «Молат», Славенскага сельсавету, Талачынскага раёну, (в. Ст.-Бураўка, Славенскага сельсавету), знайшло ў грамадзянкі Казловай М. салому, якая была пакрадзена ў калгасе. Калі мы паскардзіліся ў Талачынскі нарсуд, каб Казлову прыцягнулі да адказнасьці, дык судзьдзя сказаў: «Судзіць я не магу, за крадзеж калгаснай маемасьці трэба расстраляць, а за 10 пудоў саломы я расстрэльваць ня буду».

Пасьля гэтага ў нас сталі вельмі частымі выпадкі шкоднасьці саломы, колаў. Ніхто ніякіх захадаў ня ўжывае. Апрача гэтага ў нас ёсьць выканаўчыя лісты, па якіх нам належыць спагнаць з некалькіх грамадзян у карысьць калгасу маемасьць, якую яны, выходзячы з калгасу, забралі. Гэтыя выканаўчыя лісты ляжаць у сельсавеце і ў міліцыі ўжо тры месяцы, але ніхто не спаганяе.

Нарчук.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя спадзяецца, што пракурор Талачынскага раёну прыме адпаведныя меры па сутнасьці гэтага лісту і аб выніках паведаміць.

Пастанова Ўпаўнаважанага камітэту па загатоўках с.-г. прадуктаў пры СПА па БССР

За бязьдзейнасьць распусьціць рэспубліканскую Плодагароднную канвэнцыю і арганізаваць яе ў новым складзе з наступных таварышоў:

Красоўскага А. М. (старшыня). *Васкабойнікава М. Я. Вербы. Дзямідава. Шэрмана.*

УПАЎКАМЗАГСПА ПА БССР
БЭНЭК.

13 кастрычніка 1932 г
г. Менск

Маслазагатоўкі

УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ЕСЬЦЬ

Адкінуць заслоны „аб'ектыўных" прычын, за якімі хаваюцца адстаючыя раёны

На працягу ўдарнага двухмесячніка ліквідаваць прарывы ў маслазагатвўках

Па выкананьню цэнтралізаванага пляну маслазагатовак БССР плянецца ў хвасьце, выканаўшы плян на 10-X-1932 году толькі на 43,5 проц. у той час, калі рад рэспублік, краёў, вобласьцяй палыходзіць да выкананьня гадавога цэнтралізаванага пляну.

Такое ганебнае адставаньне ў выкананьні пляну маслазагатовак БССР тлумачыцца адсутнасьцю канкрэтных мерапрыемстваў з боку загатоўчых арганізацый па забясьпечаньні выкананьня цэнтралізаванага пляну маслазагатовак, наяўнасьцю апартуністычнай практыкі ў рабоце, спадзяваньнем на самацёк і адсутнасьцю ўвагі маслазагатоўкам з боку партыйных арганізацый.

Аналіз выкананьня пляну па сэктарох поўнасьцю падцьвярджае паказаныя прычыны. Па сацыялістычным сэктары, дзе працаздольнасьць загатавіцеляй менш адбіваецца, мы маем лепшае выкананьне пляну.

На 10-га кастрычніка 1932 году гадавы плян па калгасах выканан на 119 проц., па саўгасах—на 82 проц.. Толькі МТФ у сацыялістычным сэктары мае значнае адставаньне, выканаўшы плян на 64 проц.

Ад НКЗ, саўгасных аб'яднаньняў і Мясамалакакалгасцэнтру патрабуецца канкрэтнае кіраўніцтва каб забясьпечыць своячасовае і поўнае выкананьне пляну маслазагатовак ня толькі ў цэлым, але і ў кожным паасобку саўгасе, калгасе і МТФ.

Паводле пастановы СНК СССР ад 2-га кастрычніка 1932 г. і распараджэньня НКСаўгасаў, Наркамзему і Наркамснабу БССР усякі камэрцыйны і некамэрцыйны продаж масла саўгасамі павінен быць тэрмінова спынен, масла саўгаснай выпрацоўкі павінна быць здадзена Маслапрому ў выкананьне цэнтралізаванага пляну загатовак.

Аасаблівая ўвага павінна быць зьвернута на выкананьне пляну МТФ, якія найбольш адстаюць, складаючы 40 проц. удзельнай вагі ў агульным пляне маслазагатовак. Калі можна лічыць параўнальна здавальняючым становішча выкананьня пляну па сацыялістычным сэктары, дык індывідуальны сэктар і калгасьнікі з неабагуленай жывёлай зусім забыты.

Аднаасобнікамі плян выканан на 7 проц., а калгасьнікамі з неабагуленай жывёлай—на 5,8 проц.

Тут раённыя загатавіцелі прабуюць шукаць аб'ектыўныя прычыны і, як адну з такіх «грунтоўных» прычын, прыводзяць разрыў паміж рыначнымі і загатавіцельнымі цэнамі, апускаюць рукі і зусім не праводзяць тых мерапрыемстваў, якія з посьпехам забясьпечылі выкананьне пляну.

Разгортваньне савецка - калгаснага гандлю некаторыя работнікі загатоўчых арганізацый таксама адносяць да аднэй з прычын невыкананьня цэнтралізаванага пляну загатовак.

Зусім зразумела, што з такім апартуністычным поглядам зруху ў выкананьні цэнтралізаванага пляну гэтыя работнікі не дасягнуць.

Справа загатавіцеля—растлумачыць, што адначасова пры акуратным выкананьні абавязацельстваў па цэнтралізаваным пляне калгасьнік мае права прадаць ліпшкі малочнай прадукцыі на калгасным базары.

Мала таго—загатавіцель абавязан аказаць садзейнічаньне калгасьніку ў вывазе малочнай прадукцыі ў асартымэнце (масла, сыр, сьмятана, тварог і г.д.), па патрабаваньні рабочага спажыўца. Паколькі калгас ня мае свайго маслазаводу, загатавіцель павінен шырока арганізаваць перапрацоўку калгаснага малака на сваіх малоча-сыр заводах з тым, каб калгасьнік прадаваў гэтую прадукцыю на калгасных базарах.

У глыбінных пунктах, адкуль марудна ідзе дастаўка малочнай прадукцыі на базары рабочых цэнтраў, загатавіцель абавязан арганізаваць набыцьцё лішкаў малака і малочных прадуктаў у калгасьнікаў звыш выкананьня цэнтралізаваных плянаў па кзнвэнцыйных цэнах.

Толькі пры такой арганізаванасьці савецка-калгасных базараў будуць выкананы дырэктывы партыі і ўраду аб палепшаньні рабочага забясьпечаньня.

На кантрактантаў, якія неакуратна выконваюць месячныя і квартальныя абавязацельствы па маслазагатоўках і прадаюць сваю прадукцыю на баку—устанавіць грамадзкае ўзьдзейнічаньне, арганізоўваючы сельскія таварыскія суды.

Гаспадаркі, якія акуратна выконваюць свае абавязацельствы трэба прэміяваць, устанаўліваючы прэмію прамтаварамі ў залежнасьці ад ступені і своячасовасьці выкананьня абавязацельстваў.

Разбазарваньне (скарыстаньне без цэнтралізаваных нарадаў) малочнай прадукцыі зьяўляецца аднэй з асноўных прычын невыкананьня цэнтралізаванага пляну загатовак.

Па афіцыяльных данных, г. зн. па прызнаньні самих раённых загатавіцеляў, перавыдаткаваньне малочных прадуктаў звыш цэнтралізаваных плянаў да сягае па паасобных раёнах 422 проц. (Лагойскі раён—322 проц., Быхаўскі—217 проц., Чырвонапольскі—139 проц.).

Неабходна абвясьціць рашучую барацьбу з разбазараньнем малака і малочнай прадукцыі, накіроўваючы ўсю малочную прадукцыю цэнтралізаваных загатовак выключна па цэнтралізаваным пляне рэалізацыі. Вінаватых у разбазарваньні трэба прыцягваць да крымінальнай адказнасьці, як за разбазарваньне дзяржаўнай маёмасьці.

Да тэрміну скончэньня выкананьня пляну маслазагатовак засталося яшчэ 75 дзён. Тэрмін дастатковы для таго, каб ліквідаваць прарывы ў маслазагатоўках, дапушчаныя ў першых трох кварталах.

Раённыя партыйныя арганізацыі павінны ўстанавіць сталы непаслабны кантроль за работай загатавіцеляў, аказваючы ім рэальную дапамогу, мабілізаваўшы ўсю раённую сельскую грамадзкасьць на выкананьне пляну.

Сельскі актыў, які вылучаецца на правядзеньне маслазагатовак трэба разьбіць па аднаасобным сэктарам дзесяцідворкі і патрабаваць сталай адказнасьці ад вылучанага актывіста за выкананьне цэнтралізаванага пляну дзесяцідворак, зацікавіўшы яго прэміяльнай узнагародай за лепшую работу. Усе мерапрыемствы па выкананьні пляну маслазагатовак павінны праводзіцца пры шырока разгорнутым сацспаборніцтве і ўдарніцтве з канкрэтнымі паказьнікамі лепшага выкананьня работы па маслазагатоўках.

У абвешчаны Белмаслапромам і ўхвалены ЦК КП(б)Б ударны двухмесячнік павінны ўключыцца ўсе малочнаазагатоўчыя арганізацыі і пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый паказаць прыклад бальшавіцкай барацьбы за выкананьне гадавога цэнтралізаванага пляну маслазагатовак.

Н. БАРУТКІН.

ЗВОДКА

выкананьня пляну па малаку сыстэмы Саюзмаслапром на 10-X 1932 г. (у цитр.).

Раёны	Проц. выкан.	На якім месцы па выкананьні	Раёны	Проц. выкан.	На якім месцы па выкананьні
Слуцкі	79,3	1	Глускі	41,1	21
Чырвона-Слабодзкі	77,4	2	Асіпавіцкі	40,4	22
Касьцюковіцкі	60,4	3	Ельскі	40,2	23
Старобінскі	59,5	4	Быхаўскі	39,2	24
Крычаўскі	59,2	5	Чэрыкаўскі	37,[illegible]	25
Капыльскі	56,5	6	Жытковіцкі	36,3	26
Клімавіцкі	55,9	7	Чырвонапольскі	32,9	27
Плешчаніцкі	52,4	8	Нараўлянскі	32,4	28
Прапойскі	51,4	9	Старадарожскі	30,0	29
Тураўскі	49,4	10	Кліч ўскі	29,2	30
Лагойскі	47,5	11	Кармянскі	29,0	31
Рагачоўскі	46,1	12	Чэрвеньскі	28,5	32
Хойніцкі	46,0	13	Бярэзінскі	28,4	33
Брагінскі	44,9	14	Чачэрскі	27,0	34
Парыцкі	44,5	15	Петрыкаўскі	23,5	35
Вузьдзенскі	43,9	16	Лельчыцкі	13,7	36
Дзяржынскі	43,7	17			
Лоеўскі	43,7	18			
Бягомльскі	43,5	19	Разам	41,9	[illegible]
Камарынскі	42,0	20			

Рэчыцкі і Жлобінскі раёны, прымеце выклік Цер хоўшчыны!

(Ліст сакратароў партячэек, старшынь сельсаветаў і старшынь калгасаў Церахоўшчыны).

У сваёй адозьве вуцёўцы прапануюць пераключыцца на баявую работу па стварэньні моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Цалкам згадзіўшыся з тым, што мы слаба вялі барацьбу за сілос, па шыраная нарада сакратароў партячэек, старшынь сельсаветаў і старшынь калгасаў Церахоўшчыны падтрымлівае ўсе прапановы і сацыялістычныя патрабаваньні пленуму Вуцёўскага сельсавету і бярэ абавязацельства ўлічыць усе крыніцы сілоснай сіравіны ў кожным калгасе, саўгасе і сельсавеце і на падставе іх даць каляндарнае заданьне кожнаму сельсавету па выкарыстаньні на сілос усіх відаў зялёнай масы.

Для апэрацыйнага кіраўніцтва работай па сіласаваньні кармоў пры райвыканкоме створаем баявую пяцёрку, пры кожным сельсавеце тройку.

Для апратэхнічнага кіраўніцтва сіласаваньнем кармоў у капцох пералічаем на гэтую работу ўвесь тэхнічны пэрсанал райза МТС, калгассаюзы.

Ручы на сябе гэтыя абавязкі, мы запэўніваем, што ў найкарацейшы тэрмін будзе ліквідаваны дапушчаны намі прарыў. Да XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі мы будзем рапартаваць партыі і ўраду аб перамогах па стварэньні моцнай кармовай базы.

Мы выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва па сіласаваньні кармоў Жлобінскі і Рэчыцкі раён. Адначасова заклікаем усе саўгасы, калгасы, сельсаветы БССР уключыцца ў бальшавіцкі паход за сілос, каб да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаць і перавыканаць плян сіласаваньня кармоў.

Сакратар РК КП(б)Б СУРБА
Старшыня РВК Дупанаў
Сакратар райкому ЛКСМБ РАТНЭР
Рэдактар раённай газэты «Ударнік Калгасаў» ВЕДЗЬ
Заг. райза ВАРГАНАЎ
Дырэктар МТС АНАНАЎ
Старшыня РКС ПРОХАРАЎ
Аграномы КАРАНЯКА, МАКСІМАЎ, ЛІБЭРМАН.
Сакратары партячэек (24 подпісы)
Старшыні і члены праўленьняў калгасаў (48 подпісаў).

Шэфы рабочыя дапамагаюць прыга раднай гаспадарцы у ўборцы моркаўкі

Новае кіраўніцтва Асьвейшчыны павінна разгарнуць асавую работу саветаў

Прычыны прарываў Асьвейскага раёну па гаспадарча-палітычных кампаніях—гэта поўная адсутнасьць арганізаванай работы ў сельсаветах, адсутнасьць работы ў сэкцыях і дэпутацкіх групах.

Характарна адзначыць, што прэзыдыум і сакратарыят РВК за час свайго існаваньня не закранулі ніводнага пытаньня аб масавай рабоце саветаў, райвыканком таксама ня ўжыў адпаведных захадаў, каб ліквідаваць цякучасьць інструктароў па саўбудзе.

Чым тлумачыцца тое, што ў разгары ўборачнай кампаніі ўсе адказныя работнікі РВК апрымалі адпачынак і ў РВК на працягу двух месяцаў працаваў выключна тэхпэрсанал. Работнікі РВК лічаць, што яны павінны працаваць выключна ў габінэтах РВК, і на працягу году ніхто з іх не выяжджаў у сельсаветы.

І не выпадкова, калі арганізаваныя ў 10 сельсаветах сэкцыі і дэпутацкія групы яшчэ на сёньня не распачалі ніякай работы.

У выніку адсутнасьці масавай работы Малашкаўскі і Сухараўскі сельсаветы ня злазяць з чорных дошчак па цэлым радзе мерапрыемстваў і кампаній. Масавая работа на Асьвейшчыне і асабліва ў гэтых сельсаветах цалкам падмяняецца штрафамі, адміністраваньнем і бюракратычным камандаваньнем.

Побач з гэтым вядомыя кулакі Давыдзёнак і Ганчар яшчэ і зараз не абкладзены цьвёрдымі заданьнямі: «проста з галавы выпала»,—апраўдваюцца сельсаветчыкі.

Новы закон аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку не распрацоўваўся сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, у выніку гэтага ўлік аб'ектаў абкладаньня вытвараўся «на вока» і налічэньні адмяняліся па тры і чатыры разы. З вялікім спазьненьнем акладныя лісты былі дасланы платнікам, але ўжо на 1 паседжаньне прэзыдыуму было пададзена 100 заяў аб няправільным налічэньні падаткаў.

Дрэнна пастаўлена масавая работа і ў партячэйках сельсаветаў. Так, партуп'аўнаважаны райкому партыі, Лесін ўвёў сыстэму канвэерных сходаў, на якіх за адну гадзіну разглядаецца 6 пытаньняў—«ход пасеўнай» і «задачы ўборачнай», «пляны загатовак» і інш. Супроць такой сыстэмы партарганізацыі Асьвейшчыны ўсім не змагаюцца.

Масавая работа саветаў Асьвейшчыны павінна быць пастаўлена на належную вышыню—гэта баявая задача Асьвейскага РВК і райпартарганізацыі.

ШЧАМЕЛЬ.

І. А. ГАЛАЎНЁЎ

Аддзелы рацыяналізацыі і ячэйкі вынаходнікаў за скарыстаньне адыходаў і выраб шырспажыву

Рацыяналізацыя вытворчасьці зьяўляецца лепшым спосабам зьніжэньня сабекошту, паляпшэньня якасьці прадукцыі, узьвяшчэньня прадукцыйнасьці працы і магутным сродкам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў у прамысловасьці.

Шэсты XVI-ы Зьезд УсеКП(б) у сваіх рашэньнях адзначыў:

«... што сацыялістычная рацыяналізацыя зьяўляецца лепшым сродкам мабілізацыі скрытых магутных рэзэрваў і зьніжэньня сабекошту, павінна стаць неад'ёмнай часткай практычнай работы ўсяго адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прамысловасьці і быць у цэнтры тэхніка-вытворчай работы прадпрыемства... Работа па рацыяналізацыі павінна быць шчыльна ўвязана з сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, пры тым павінны быць шырока скарыстаны рабочыя прапановы і вынаходзтвы».

Побач з гэтым, на сацыялістычных прадпрыемствах павінна разгортвацца такая работа, якая-б паказала рабочай клясе СССР тую розьніцу, якая існуе паміж рацыяналізацыяй сацыялістычнай і капіталістычнай.

У капіталістычных краінах рацыяналізацыя праводзіцца ў мэтах павялічэньня эксплёатацыі што вядзе да павялічэньня беспрацоўя, а тым рабочым, якія застаюцца на вытворчасьці ў сувязі з капіталістычнай рацыяналізацыяй зьніжаецца зарплата і павялічваецца працоўны дзень.

У выніку капіталістычнай рацыяналізацыі, капіталісты ня зьніжаюць цэн на тавары, не палепшваюць умоў жыцьця рабочых, а павялічваюць свае прыбыткі, якія ім дае рэалізацыя рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

У задачу сацыялістычнай рацыяналізацыі уваходзіць у першую чаргу барацьба за сацыялістычныя тэмпы, за палепшаньне дабрабыту рабочых мас. Сацыялістычная рацыяналізацыя вывучае і рацыяналізуе вытворчыя працэсы з мэтай палепшаньня ўмоў працы і жыцьця рабочай клясы. Рацыяналізацыя дапамагае выкрыць і скарыстаць унутраныя рэсурсы на вытворчасьці, замяняе дэфіцытныя імпартныя матар'ялы дабраякаснымі сурагатамі, дае шмат каштоўных вынаходак. Асаблівую ролю сацыялістычная рацыяналізацыя адыгрывае ў справе зьніжэньня сабекошту прадукцыі. Сацыялістычная рацыяналізацыя зьяўляецца аднэй з асноўных крыніц сацыялістычнага накапленьня.

Нам вядома, што сацыялістычная прамысловасьць і сацыялістычная сельская гаспадарка маюць страты, якія дасягаюць значных сум толькі з-за таго, што нерацыянальна скарыстоўваецца сыравіна і матар'ялы на прадпрыемствах, што тая колькасьць адыходаў, якія атрымліваюцца ў працэсе вытворчасьці, на шмат якіх прадпрыемствах не рацыянальна скарыстоўваюцца, а ў сельскай гаспадарцы вялікія страты атрымліваюцца з тэй прычыны, што да апошняга часу, значная колькасьць збожжа зьбіраецца ўручную, а тыя машыны, якія ёсьць у саўгасах і калгасах, не ўдасканальваюцца, не прыстасоўваюцца да іх удасканаленьня часткі і г. д.

Органы рацыяналізацыі павінны накіроўваюць усю сваю працу па шляху вывучэньня і поўнага скарыстаньня скрытых рэсурсаў народнае гаспадаркі Савецкага саюзу. Бязумоўна, што перад органамі рацыяналізацыі зараз стаіць вялікая задача ў справе лепшай пастаноўкі работы на прадпрыемствах сацыялістычнае індустрыі. Вакол гэтага пытаньня неабходна разгарнуць вялікую растлумачальную работу, уцягнуць у гэту справу шырокія масы рабочых лепшых ударнікаў, ІТР, шматлікі актыў рабочых-вынаходцаў. Ячэйкі вынаходцаў, што арганізаваны ў пачатку бягучага году на прадпрыемствах, павінны мабілізаваць актыў рабочых вынаходцаў і ўсю рабочую грамадзкасьць прадпрыемстваў на справу вывучэньня лепшага скарыстаньня адыходаў прамысловасьці і шляхам рэалізацыі рабочых прапаноў знайсьці мэтады лепшага скарыстаньня адыходаў і выробу з іх дадатковай прадукцыі шырокага спажываньня.

Трэба ведаць, што рабочыя прапановы і вынаходзтвы адыгрываюць вялікую ролю ў справе лепшай пастаноўкі работы на прадпрыемстве, у справе ўнутрыпрамысловага накапленьня. Таму Аддзелы рацыяналізацыі і ячэйкі вынаходцаў на прадпрыемствах павінны ў штодзённай сваёй працы аказваць усялякую дапамогу вынаходцам і, накіроўваць вынаходзкую думку на больш вузкія месцы ў працы прадпрыемстваў.

Надаючы вельмі вялікае значэньне максымальнаму скарыстаньню адыходаў прамысловасьці і дадатковага выробу прадметаў шырокага спажываньня, якія пашыраюць таваразварот паміж горадам і вёскай і зьяўляюцца мацнейшым вагаром у справе пашырэньня і ўмацаваньня савецка-калгаснага гандлю, аддзел рацыяналізацыі і ячэйкі вынаходцаў павінны з бальшавіцкай упартасьцю вывучаць ўсе працэсы вытворчасьці, мабілізаваць на гэту справу лепшых ударнікаў рабочых і ІТР, асабліва тых рабочых, якія маюць вялікі працоўны стаж, якія добра ведаюць мэханізмы, машыны і тэхналёгічныя працэсы вытворчасьці паасобных цэхаў, агрэгатаў, прадпрыемстваў. Трэба работу паставіць так, каб сыравіна, паўфабрыкаты, матар'ялы і г. д., скарыстоўваліся поўнасьцю, каб пазьбегнуць браку, пераробак, каб давесьці да мінімуму адыходы, а тыя адыходы, якія атрымліваюцца ў тэхналёгічных працэсах вытворчасьці, каб максымальна скарыстоўваліся на сваім прадпрыемстве, даючы максымальную напрузку ўтыльцэхам.

У 1932 г. праца на прадпрыемствах БССР як на агульнай рацыяналізацыі, так і БРІЗ'у значна палепшылася. Плян рацыяналізацыі ўваходзіць у агульны прамфінплян прадпрыемстваў, як яго складаная частка. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы маюць у сярэднім да 60 проц. удзельнай вагі ў агульным запраектаваным пляну зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

У параўнаньні з 1931 годам, у гэтым годзе мы маем павялічэньне колькасьці паступаючых рацыяналізатарскіх вынаходзтваў і прапаноў. Калі ў 1931 годзе шмат рабочых прапаноў і вынаходзтваў толькі фармальна былі рэалізаваны, а фактычна заставаліся не рэалізаванымі, дык ў гэтым годзе такога зьявішча няма. Значна палепшалася работа па тэхнічнай прапрацоўцы рацпрапаноў і вынаходзтваў.

Аднак, нягледзячы на вялікі зрух у арганізацыйным палепшаньні работы па рацыяналізацыі трэба канстатаваць, што па радзе прадпрыемстваў БССР становішча работы па рацыяналізацыі не здавальняючае. Плян рацыяналізацыі не выконваецца.

Гэта тлумачыцца тым, што па радзе прадпрыемстваў прынятыя прапановы не рэалізуюцца.

Так, на Менскім абутковай фабрыцы прапанова тав. Райхена «Рэзак для рэзкі язычкоў» прынята і не рэалізуецца. На скур-галянтарэйнай фабрыцы «Усход» прынятая прапанова «Ручны станок для надзяваньня калец на ручкі для чамаданаў» не рэалізуецца. Такія факты маюць месца яшчэ і на радзе іншых прадпрыемстваў БССР.

Трэба сказаць, што БРЫЗ'ы на прадпрыемствах слаба кіруюць работай вынаходцаў, няма сталых кадраў вынаходцаў. Ёсьць выпадкі, калі рабочыя прапановы затрымліваюцца з тэй прычыны, што адсутнічае тэхнічная дапамога вынаходцам. Напрыклад, на галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» прапанова рабочага замяніць ручную работу па рэзцы пасты мэханізмам не праводзіцца з-за адсутнасьці тэхнічнай дапамогі. У большай частцы гэта тлумачыцца тым, што штаты аддзелаў рацыяналізацыі і БРІЗ-аў не укамплектаваны работнікамі адпаведнай кваліфікацыі.

Грамадзкія арганізацыі па радзе прадпрыемстваў праводзяць недастатковую работу ў галіне рабочага вынаходзтва, на некаторых прадпрыемствах няма ячэек вынаходцаў.

Зусім інакш пастаўлена работа на тых прадпрыемствах, дзе работа аддзелу рацыяналізацыі, БРЫЗ-аў і ячэек вынаходцаў пастаўлена на належную вышыню. Прыкладам гэтай работы зьяўляецца аддзел рацыяналізацыі, БРЫЗ і ячэйка вынаходцаў Менскага Чырвона-Штандарнага заводу «Бальшавік», дзе работнікі аддзелу рацыяналізацыі і ячэйкі вынаходцаў сваячасова мабілізаваліся на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб дадатковым выробе прадукцыі шырокага спажываньня і максымальным скарыстаньні адыходаў прамысловасьці. На заводзе «Бальшавік» была разгорнута вялікая масавая работа. На заводзе былі выпушчаны лёзунгі, плякаты, спэцыяльныя бюлетэні па пытаньні дадатковага выробу прадукцыі шырокага спажываньня з адыходаў.

У завадзкой шматтыражцы «Рабочае Вока» зьмяшчаліся артыкулы на тэму, што даюць адыходы. Арганізавана выстаўка, дзе паказана, што маг чыма атрымаць з капытоў, касьцей, папіровай макулатуры, рызьзя, гумы і г. д.

Аддзелам рацыяналізацыі і ячэйкай вынаходцаў быў абвешчаны конкурс на лепшую прапанову па скарыстаньні адыходаў, выпушчаны прэміі на суму 500 р.

Праводзіліся гутаркі па цэхах і брыгадах, у выніку чаго ўмацаван арганізацыйна ўтыльцэх, устаноўлены дзве швэйныя машыны, цэх забясьпечан кваліфікаваным рабочай сілай, значна павялічылася колькасьць рабочых, праведзена падзяленьне працы, працэс наклейкі вылучаны ў асобную операцыю і выконваецца менш кваліфікаванай сілай. Цэх пераведзен на гаспадарчы разьлік і выдзельную аплату працы.

Праведзен рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы кадраў для утыльцэху, пастаўлены на работу вучні жаночы на тых працах, якія раней выконваліся дарослымі мужчынамі і таксама праведзена падрыхтоўка жаночых работніц на зам. майстра закройшчыка. Шырока разгорнутая работа на заводзе за максымальнае скары

ЗА ГРАНІЦАЙ

САБАТАЖ СПРАВЫ МІРУ

Больш дальназоркі буржуазны друк, разумеючы, чым пагражае капіталістычнаму сьвету новая сусьветная вайна, б'е трывогу. Лёндонскі кансэрватыўны штотыднёвік «Обсэрвэр» піша, што абвастрэньне франка - германскіх адносін прывядзе на працягу некалькіх год да вайны.

Савецкі саюз зьяўляецца адзінай краінай, урад якой можа быць спакойны наконт ацэнкі яго палітыкі грамадзкай думкай дзесяткаў мільёнаў, якія ў выпадку вайны будуць мець у сваіх руках рашэньне лёсу мірнага. У момант аграмаднейшага абвастрэньня становішча на Далёкім Усходзе савецкі ўрад ня згубіў ні на адзін момант спакойлівасьці і з жалезным спакоем праводзіў палітыку міру, якая прымусіла нават найбольш мілітарысцкія элемэнты хоць бы на даны момант адмовіцца ад лёгкадумнай гульні з справай міру.

На захадзе савецкі ўрад ня толькі дабіўся падпісаньня пактаў аб ненападзе з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй і Польшчай, але дамогся таго, што нават буржуазны друк гэтых краін павінен быў прызнаць, што савецкі ўрад кіруецца жаданьнем захаваць мір. Гэтыя перамогі мірнай палітыкі савецкага ўраду ўзмацнілі ва Францыі тыя элемэнты, якія насупераки разбэшчанай алтысавецкай агітацыі органаў аружэйных форм, пашлі насустрач мірнай палітыкі савецкага ўраду, адказваючай поўнасьцю імкненьням францускага пралетарыяту, сялянства і францускай працоўнай інтэлігенцыі.

Адзіным суседам Савецкага Саюзу, які доўга супраціўляўся перагаворам аб пакце аб ненападзе, зьяўляецца Румынія. Але нават клікі, пануючыя ў гэтай краіне, не маглі ўстаяць перад уплывам перамог мірнай савецкай палітыкі, не маглі проста адмовіцца ад заключэньня пакту аб ненападзе. Ім прышлося на працягу амаль году ўвесь час разбураць пад розьнымі прычынамі ўжо амаль дасягнутую згоду. Прычынай усяго зьяўляўся пункт, які датычыцца Бэсарабіі. Румынскія кіруючыя клікі ім кпуліся да таго, каб за заключэньне пакту аб ненападзе вытаргаваць усклонае прызнаньне савецкім урадам румынскай акупацыі Бэсарабіі. Цьвёрды адказ савецкага ўраду, што ён ня мае ніякай прычыны ўзнагароджваць Румынію за падпісаньне пакту аб ненападзе, у якім Румынія па крайней меры ня менш зацікаўлена, чым усе іншыя краіны, што ўжо падпісалі аналягічныя пакты, прымушаў румынскую дыпляматыю адступаць назад. Але гэта прыводзіла толькі да таго, што чарговы румынскі ўрад дэзавуяваў сваіх прадстаўнікоў, каб пачынаць казку пра белага бычка спачатку.

Гэта палітыка, якая пераходзіць, ужо ў камэдыю, прыняла за апошнія дні проста форму фарсу. Румынскі пасол у Лёндане п. Тытулеску выступіў адкрыта супроць палітыкі ўраду Вайда-Вайводы і падаў у адстаўку. На гэты бунт свайго прадстаўніка ўрад адказаў прызначэньнем яго міністрам замежных спраў, заяўляючы адначасова, што яно ў далейшым імкнецца да заключэньня дагавору аб ненападзе. Пан Тытулеску з свайго боку адказаў на заяву свайго ўраду паведамленьнем у парыскай газэце «Рэпюблік», зьмест якога зводзіцца да спробы сабатажу пакту аб ненападзе.

Румынскія пануючыя колы павінны будуць даць дакладны і нядвусэнсовы адказ на пытаньне, ці хочуць яны пакту аб ненападзе, якога дабіваюцца за ўсёй Эўропе і ў прыватнасьці ў Румыніі ўсе элемэнты, зацікаўленыя ва ўмацаваньні міру на ўсходзе Эўропы, або яны хочуць дапамагчы тым элемэнтам у міжнароднай палітыці, якія бачаць у Румыніі найбольш зручную краіну для зрыву справы міру. Мы ўстрымліваемся поўкуль што ад канкрэтнага адказу на пытаньне: хто гэтыя элемэнты, выказьнікам якіх зьяўляецца п. Тытулеску, і па даручэньні якіх ён зрывае справу ўмацаваньня міру. Дастаткова сказаць, што гэтыя элемэнты спадзяюцца, што калі пакт паміж Румыніяй і Савецкім Саюзам ня будзе заключаны, дык павісноць у паветры пакты, ужо падпісаныя Польшчай, і савецка - францускі пакт. Гэтыя элемэнты спадзяюцца, што зрыў усёй палітыкі пактаў прывядзе да абвастрэньня становішча ва ўсходняй Эўропе і дазволіць лавіць рыбу ў каламутнай вадзе, тым, хто абавязкова хацеў-бы ўцягнуць Савецкі Саюз у сетку імпэрыялістычных супярэчнасьцяй, разьдзіраючых капіталістычны сьвет.

Мы ня будзем тут гадаць, ці падпадпадкуюцца саюзьнікі Румыніі прадпісаньням тых міжнародных элемэнтаў, экспанэнтам якіх зьяўляецца п. Тытулеску, або не. Рашаючым зьяўляецца той факт, што грамадзкая думка ўсяго сьвету зразумее канчаткова, хто за мір, і хто супроць яго.

Міжнародная ўдзельная вага Румыніі нязначная... Яе ваенную сілу мы ня можам ацэньваць вышэй, чым яе ацэньваюць яе саюзьнікі. Але гэта не азначае, што іменна гэта краіна, у якой народныя масы ня маюць ніякага ўплыву на курс ўраду, дзе буржуазія і памешчыкі становяць сабою клікі, што знаходзяцца ў бесьперапыннай бойцы, дзе рашаючы ўплыў на ўрадавую палітыку маюць прыдворныя клікі, зьвязаныя з авантуры стамі міжнароднага імпэрыялізму, што іменна гэта краіна не становіць сабою небясьпекі для справы міру. Гэта вельмі добра даказаў новы румынскі міністр замежных спраў Тытулеску. Калі яму ўдасца сарваць пакт аб ненападзе, — а яго разглагольствані аб неабходнасьці перагавораў на новай базе да гэтага і вядуць,—дык увесь сьвет будзе разумець, што гэта азначае. Гэта будзе а значаць, што падпальшчыкі вайны выбралі Румынію як вароты для вайны.

(Скарочаны перадавы «Известий»).

Германскія прамыслоўцы пратэстуюць супроць гандлёвай палітыкі ўраду

БЭРЛІН. 16-X. Рурскі каменнавугальны сындыкат (адно з буйнейшых прамысловых аб'яднаньняў Германіі) зьвярнуўся да рэйсканцлера раду міністраў і старшыні рэйхстагу з пэлем прамэй, у якой гаворыцца:

«Германская палітыка абмежаваньня ўвозу падрывае экспарт рурскаму вугалю ў Італію. З кожным днём адпуль надыходзяць няспрыяючыя паведамленьні. Пасьля выкананьня дзеячнічаных дагавораў, мы апынімся перад кучай развалін. Рурская каменная вугальная прамысловасьць, таксама як і астатнія, залежачыя ад экспарту, галіны прамысловасьці,—апынецца ў яшчэ больш цяжкім становішчы, чым зараз. Замест ажыўленьня гаспадаркі прадбачыцца далейшае зьніжэньне прадукцыі і рост беспрацоўя».

Гандлёвая палата Гамбургу апублікавала паведамленьне аб тым, што яна ў самай катэгарычнай форме ўказвае ўраду на выніф палітыкі контынгентаваньня, якія ўжо цяпер вядуцца ў гандлёвых адносінах з Даніяй, Галяндыяй, Італіяй і радам іншых краін.

Адозва старшыні цэнтральнага ўраду савецкага Кітаю

ШАНХАЙ. 17-X. «Шанхай-Таймс» паведамляе аб распаўсюджваньні ў Кітаі адозвы падпісанай старшынёй часовага цэнтральнага ўраду Савецкай рэспублікі Кітаю—Мао-Цзе-Дунам і адрасаванай рабочым, сялянам і ўсім прыгнечаным масам Кітаю.

У адозве ўказваецца, што даклад Літона—носіе зьвяно закабаленьня прыгнечаных мас Кітаю імпэрыялістамі і Лігай нацый, новы плян падзелу Кітаю паміж дзяржавамі і перабалшчэньня кітайскіх працоўных мас. Адозва заклікае працоўныя масы да рэвалюцыйнай барацьбы за вызваленьне Гаміндану і за ўстанаўленьне Савецкай рэспублікі ў Кітаі.

Крызіс румынскага ўраду

ВЕНА. 16-X. У Бухарэсьце ўчора распаўсюдзіліся чуткі аб выхадзе ў адстаўку ўраду Вайда-Вайводы, у сувязі з выступленьнем Тытулеску. Гэтыя чуткі былі пацьверджаны таксама афіцыйнай урадавай газэтай «Лупта». Аднак афіцыйнае румынскае агэнцтва абвяргае чуткі аб урадавым крызісе, паведамляючы, што Тытулеску, як відаць, ізноў зьвярнуўся на свой пост саслужыніка ў Лёндане.

У палітычных колах распаўсюджваюцца весткі аб значных разнагалосьях унутры ўраду. Міністр унутраных спраў і кіруючае ядро нацыянал-параністаў з старэ-румынскіх аб'ясьцей падтрымліваюць зьнешнепалітычную лінію Тытулеску, між тым, як усе сэнатары і дэпутаты парляманту (нацыянал-цараністы) ўручылі учора Вайда-Вайводзе мэмарандум, у якім заяўляюць аб сваёй безумоўнай падтрымцы яго палітыкі.

Адкрываюцца новыя міжраённыя базы прамысловасьці і спажывецкай кааперацыі

МАСКВА, Наркамлёгпром і Цэнтрасаюз арганізавалі па ўсім СССР рад оптавых баз лёгкай прамысловасьці, міжраённых баз спажывецкай кааперацыі па водпуску тэкстыльных, швэйных, скурана - абутковых тавараў. У Беларусі базы лёгкай прамысловасьці арганізуюцца ў МЕНСКУ, ВОРШЫ, ВІЦЕБСКУ, ГОМЕЛЮ, МАГІЛЕВЕ і БАБРУЙСКУ. Міжраённыя базы спажыўкааперацыі адкрываюцца ў КЛІМАВІЧАХ, СЛУЦКУ, МАЗЫРЫ, ЛЕПЕЛЕ, МАГІЛЕВЕ, БАБРУЙСКУ, ПОЛАЦКУ, ВОРШЫ, ВІЦЕБСКУ і ГОМЕЛЮ.

Дазволены Галоўлітбелу № А—54.

Узбраеньні імпэрыялістаў

БЭРЛІН. 18-X. «Кельнішэ-Цэйтунг» у артыкуле генэрала Кабіша, пад загалоўкам: «Рэарганізацыя рэйхсвэра» падкрэсьлівае, што буйныя ў ваенных адносінах эўрапэйскія дзяржавы ня выканалі сваіх абавязацельстваў у галіне разбраеньня: Аб гэтым сьведчаць, паводле слову аўтара, даныя аб узбраеньні Германіі з аднаго боку, і Францыі, Польшчы, Бэльгіі, Англіі і Італіі—з другога. Згодна гэтых даных, Германія мае ў сваім карыстаньні ні ў мірны час 1134 лёгкіх кулямётаў, 792 цяжкіх кулямётаў і 288 лёгкіх гарматаў. З прычыны Вэрсальскай забароны Германія зусім пазбаўлена цяжкіх гармат, танкаў і ваенных самалётаў.

У той-жа час француская армія ў мірны час узброена 16.000 лёгкіх кулямётаў і 15.000 цяжкіх кулямётаў, 1800 лёгкіх гармат, 100 цяжкіх гарматаў, 1527 танкамі і 1710 ваеннымі самалётамі. У ваенны час Францыя будзе карыстацца 26.000 лёгкімі кулямётамі, 19.000 цяжкімі кулямётамі і 4300 лёгкімі гарматамі, 200 цяжкімі гарматамі, 3500 танкамі і 2800 ваеннымі самалётамі.

Англія ў мірны час карыстаецца 10.000 лёгкіх кулямётаў, 4200 цяжкіх кулямётаў, 500 цяжкіх гармат, 580 танкаў і 1509 ваенных самалётаў, лік якіх у ваенны час вырасьце да 2400.

Польская армія ўзброена ў сучасны момант 6.700 лёгкімі кулямётамі. У ваенны час польская армія будзе ўзброена 21,700 лёгкіх кулямётаў.

Далей Кабіш падае даныя аб флёце ў Германіі і Францыі.

Агульны тэнаж германскага ваеннага флёту складае 168.000 тон, францускага—908.000 тон. Германія мае ў карыстаньні 38 ваенных караблёў, Францыя—237 (бяз суднаў спэцыяльнага прызначэньня). У германскім ваенным флёце налічваецца разам з афіцэрскім складам 15.000 чал., у францускім—64.000 чал.

500 забастовак у адзін месяц

БЭРЛІН. 17-X Забастовачная барацьба, якая ідзе ва ўсіх раёнах Германіі, ахапіла таксама і камунальных рабочых, якім пагражае зьніжэньне зарплаты на 4—7 пфэнінгаў у гадзіну.

У Бэрліне, у выпадзе пратэсту супроць зьніжэньня зарплаты, забастовалі 1200 беспрацоўных, якія былі прыцягнуты да працы на камунальных будаўнічых работы ў абавязковым парадку. Беспрацоўныя патрабуюць ня толькі адмены зьніжэньня зарплаты, але і палепшаньня ўмоў працы.

Началіся забастоўкі на радзе прадпрыемстваў у Гамбургу і Кенігсбэргу.

Поўнай перамогай закончылася забастоўка рабочых тэкстыльнай фабрыкі ў Гладбах-Рэйдэ. Забастоўкай кіравала рэвалюцыйная прафазацыя. Рэфармісцкія і каталіцкія прафбюракраты адкрыта сабатавалі забастоўку.

Поўнай перамогай закончылася так сама забастоўка 2000 беспрацоўных у Обэргштэйдары, якія дабіліся павышэньня свае зарплаты на 20 проц.

Вышэйшая сёньня «Ротэ-Фанэ» у перадавым артыкуле піша з прычыны разгортваючайся ў Германіі забастовачнай барацьбы: «500 забастовак на працягу месяца вось адказ германскага пралетарыяту на надзвычайны дэкрэт ад 14 верасьня. Ён разьбівае друку, якая прапаведуецца рэфармістамі на працягу 10 год, што сем год у часе эканамічнага крызісу ня можна баставаць, што забастоўкі ў сем год крызісу асуджаны на правал... Рабочая клясэ ў сваёй сёньняшняй барацьбе разьбіла гэты штрэйкбрэхерскі гарэмэнт рэфармізму. Сотні тысяч арганізаваных прафэсіяльных рабочых зразумеюць на гэтых тыдніях, што путарыі прафбюракратаў аб тым, што на працягу сямі год крызісу нельга баставаць, зьяўляецца апраўданствам, якое ставіць на мэце устрымаць рабочых.

Амэрыканскі друк аб франка-японскіх адносінах

НЬЮ-ЁРК. Пазыцыя Францыі ў Манчжурскім пытаньні ня дружаскія адносіны да Японіі не перастаюць быць прадметам самага жывога абгаварэньня ў амэрыканскага друку. Парыскі карэспандэнт «Нью-Ёрк-Таймс» у артыкуле пад загалоўкам «Інтарэсы ў Інда-Кітаі кіруюць палітыкай Францыі», піша:

«Шматлікія назіральнікі бачаць сувязь паміж друкалюб'ем Францыі ў адносінах да Японіі і францускімі ўкладаньнямі ў Інда-Кітаі». Карэспандэнт «Нью-Ёрк-Таймс» указвае, што «кагёнальныя інтарэсы Францыі часта аказваюць уплыў на яе палітыку ў Эўропе. Францыя вельмі зацікаўлена выгодным гандлем, які вядзе Японія з Інда-Кітаем, які вывозіць праз Сайгонскі порт у Японію цукар, вугаль, алово, граф'іт і волава.

Спасылаючыся на кнігу Джэмса Джэрара «Мая місія ў Японіі» карэспандэнт указвае, што заключаны ў 1907 годзе паміж Францыяй і Японіяй дагавор аб узаемным падтрыманьні і ахове тэрытарыяльных правоў абодвух краін у Азіі, асабліва ў Кітаі, быў пасьля «дапоўнены шляхам абмену лістамі, у якіх гэтыя тэрытарыяльныя правы былі акрэсьлены наступным чынам: Японія-Манчжурыя, Манголія і Фунцзян, для Францыі—Юнань Гузньдунь».

«На аснове гэтай згоды з Японіяй,—піша карэспандэнт,—будуецца шмат тэорый. Гэтай згодай плюмяцыцца «сяброўскі нэйтралітэт» Францыі ў Манчжурскіх справах і ўказваецца, што Францыя гатова зараз анэксаваць (за хапіць) Юнань і што галоўным чынам Францыя зьяўляецца алкаванай за мягкі тон спраэдачы Літона».

Зрыё інструктуе Тытулеску

ПАРЫЖ. 12-X. «Тан», «Пці Парызьен» і «Журналь» паведамляюць, што ўчарайшая гутарка Зрыё з Тутулеску датычылася ў галоўным савецка-румынскага пакту аб ненападзе». «Журналь дэ дэба» паведамляе, што Тытулеску будзе мець сёньня паўторнае спатканьне з Зрыё.

***

ВЕНА. 15-X. Румынскі друк паведамляе з Парыжу, што ў часе перагаворaў паміж Тытулеску і Зрыё «была дасягнута далёка ідучая згода».

«Дзімініяца» выказвае надзею, што «перагаворы аб заключэньні пакту аб ненападзе будуць даведзены да пасьпяховага канца і зробяць магчымым заключэньне ўсходняга Лёкарно».

Японцы бомбандыруюць Нанлін

ШАНХАЙ. 16-X. Паводле паведамленьняў з кітайскіх крыніц у Нанкіне, становішча ў Жэхэ робіцца ўсё больш напружаным пасьля таго, як японская войска пачало артылерыйскую бамбардыроўку Нанліну.

У кітайскіх колах Паўночнага Кітаю думкі наконт характару, гэта выступленьня японцаў падзяляюцца: некаторыя лічаць гэтае выступленьне простай дэманстрацыяй, а другія пад рыхтоўкай да апэрацый шырокага маштабу.

Паводле некаторых паведамленьняў,—японцы мабілізавалі вялікія сілы для рашучага наступленьня супроць кітайскіх валяцёрскіх часьцей на ўсходніх межах Жэхэ.

Галадоўка палітзьняволеных у Румыніі

ВЕНА. 17-X. Паводле спозьненых паведамленьняў з Бухарэсту, палітзьняволеныя камуністы Кішанеўскай турмы абвясьцілі 5-га кастрычніка галадоўку пратэсту супроць зьверскага турэмнага рэжыму.

Менскія ЗРК рыхтуюцца да Кастрычніка

Новая хваля актыўнасьці, выкліканая адозвай ленінградзкіх пралетараў, захапіла і рад каапэрацыйных арганізацый. Многія менскія ЗРК узялі на сябе абавязацельствы—даць рабочым да XV гадавіны Кастрычніка сьвяточныя пайкі. Як ЗРК забясьпечваюць рэалізацыю ўзятых на сябе абавязацельстваў. Гэтаму пытаньню была прысьвечана спэцыяльная нарада, скліканая аддзелам рабочага забясьпечаньня ЦСПСБ.

Лепш за ўсіх прауцецца да сьвята ЗРК Чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік». Выконваючы дырэктыву кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб узмацненьні самазагатовак,—праўленьне ЗРК праводзіць рад мерапрыемстваў на забясьпечаньні выдачы сьвятошнага пайка галоўным чынам за лік самазагатовак. Праўленьне ЗРК пачало з таго, што абмяркавала разьмеры пайка на сходах прафгруп. Улічваючы пажаданьні рабочых, праўленьне ЗРК накіравала сваім сталым загатоўцам ліст, у якім указвае, што рабочыя заводу «Бальшавік» узялі на сябе абавязацельствы выканаць да тэрмінова прамфінплян і што праўленьне ЗРК з свайго боку абавязалася выдаць рабочым сьвятошны паёк і тым самым нясе адказнасьць за датэрміновае выкананьне прамфінпляну. Склаўшы для кожнага загатоўцы заготфінплян, праўленьне ЗРК вызначыла звыш звычайнай прагрэсыўнай прэміі, яшчэ тры прэміі за выкананьне і перавыкананьне плянаў загатовак. Заўком вылучыў трох лепшых ударнікаў у дапамогу загатоўцам. На месьнік старшыні праўленьня камандыраваны ў раёны загатовак для непасрэднага кіраўніцтва.

Адначасова праўленьне ЗРК прыняла захады да ўмацаваньня завозу прадметаў шырспажыву для вёскі. У раёне загатовак ЗРК адкрыў сустрэчны ларок, які гандлюе галоўным чынам ліцамі (20 проц.) прадукцыі заводзкага ўтыльцэху. Апрача таго, праўленьне ЗРК заключыла дагавор з заводакіраўніцтвам на выраб кухоннага начыньня і іншых прадметаў на 7.200 руб. з бляшаных каробак.

Сярод самаабавязацельстваў праўленьне ЗРК заводу «Бальшавік» ёсьць яшчэ такія: да Кастрычніцкіх сьвят забясьпечыць ўсіх рабочых дравамі, выдаць усім поўную норму бульбы, датэрмінова скончыць засолку гурбцоў і закваску капусты. Гэтыя абавязацельствы амаль выкананы. Плян засолкі гуркоў перавыкананы (замест 30 тон—34 тоны) на 6 дзён раней (24-га верасьня замест 1-га кастрычніка). 75 проц. рабочых ужо атрымалі дровы, для астатніх дровы атрыманы (для паскарэньня адгрузкі выяжджаў старшыня ЗРК тав. Суражынскі). Дровы дастаўляюцца на кватэры рабочым выключна заводзкім транспартам. Бульбу атрымалі 50 проц. рабочых, выдача працягваецца. Каб палегчыць рабочай сям'е ў атрыманьні бульбы, арганізаваны тры пункты выдачы ў розных раёнах гораду.

Праўленьне ЗРК «Бальшавік» сапраўды па-бальшавіцку выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы. Паводле данных відаць, што сьвяточны паёк для рабочых гарбарні будзе цалкам забясьпечан.

Ня дрэнна рыхтуецца да сьвята ЗРК мэталістаў. На самазагатоўкі пасланы лепшы ўдарнік, рэдактар шматыражкі заводу імя ВАРАШЫЛАВА. Зьбіраюцца паслаць яшчэ чатырох ударнікаў. У рыбацкія арцелі, якія забясьпечваюць ЗРК рыбай, таксама пасланы рабочы ўдарнік для ўзмацненьня адгрузкі. 30 трусоў пастаўленьня адгрузкі. 30 трусоў пастаўленьня на адкорм. ЗРК адкрывае яшчэ тры буфэты, закупае выстарчальную колькасьць садовіны.

Праўленьне ЗРК швэйнай фабрыкі імя КРУПСКАЙ паслала на самазагатоўкі двух брыгадзіраў, арганізавала два сустрэчных ларкі з прадметамі перавозкі бульбы, рабочыя прынесьлі з дому 268 мяшкоў.

ЗРК швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» арганізаваў 5 пунктаў па выдачы бульбы. Рабочым, якія жывуць далёка ад гэтых пунктаў, ЗРК дае фурманку для перавозкі бульбы. Удапамогу загатоўцам пасланы член праўленьня ЗРК, выяжджаюць яшчэ тры рабочых фабрыкі. У парадку сустрэчнага гандлю, ідзе ўзмоцненая падвозка ў раёны загатовак прадметаў шырспажыву. Для палегчаньня свайго фінансавага становішча, ЗРК сабраў авансы пад сьвяточны паёк. Гэта мерапрыемства ўхвалена сходамі рабочых.

Горш у ЗРК абутковай фабрыкі: тут працуюць без пляну. «Колькі загатовім—столькі раздамо»—кажа старшыня ЗРК тав. Гольдзін. Двух ударнікаў паслалі для ўзмацненьня самазагатовак, аднаго на рыбны вучастак. Але паколькі няма пляну загатовак, няма і бальшавіцкай барацьбы за рабочае забясьпечаньне.

Яшчэ горш у ЗРК дрэаапрацоўшчыкаў. Для сьвяточнага пайка не хапае яшчэ многа, тым ня менш парткалектыў і заўком заводу імя МОЛАТАВА адмаўляюць ЗРК у дапамозе.

Патрэбны працаздольныя загатоўцы, арганізатары, але заўком вылучае людзей, якія з гэтым не спраўляюцца. Пасьля доўгіх патрабаваньняў ЗРК атрымаў на дапамогу аднаго ўдарніка і ўсяго на 4—5 дзён.

***

Удзельнікі нарады зразумелі, што ім трэба раўняцца па гарбарох і мэталістах.

Задача ня толькі ў тым, каб загатовіць патрэбныя прадукты, але і захаваць іх да сьвята і своячасова раздаць пайнікам, ліквідаваўшы чаргі. Трэба ўлічыць, што разам з прадуктамі самазагатовак трэба будзе раздаць яшчэ значную колькасьць прадуктаў, атрыманых з цэнтралізаваных фондаў. Патрэбна асабліва гнуткасьць і арганізаванасьць каапэрацыйнага апарату, каб справіцца з гэтай вялікай работай.

І. В.

Рабочы тэатр ЦСПСБ у Менску

Пасьля 6-месячных гастролей па Беларусі зьявіўся ў Менск і пачынае сваю работу рабочы тэатр ЦСПСБ.

Тэатр пабываў у Полацку, Воршы, Горках, Бабруйску і на дарожным будаўніцтве, а таксама абслугоўваў вайсковыя часьці. Усяго тэатрам было дадзена каля 150 спэктаклёў. Пралетарская грамадзкасьць горача сустракала рабочы тэатр за гэты час. Тэатрам атрыманы прэмії грашыма і пачэсныя граматы.

Новы сэзон тэатр пачынае сёньня прэм'ерай «Кухня сьвятасьці». «Кухня сьвятасьці» зьяўляецца сатырычнай апэрэтай антырэлігійнага характару па п'есе «Мільён Антоніёў». Аўтары апэрэты — Градаў і Арлоў, музыка Цікоцкага, пастаноўшчык Галаўчынэр.

У рэпэртуары тэатру п'есы «Чынгіль буд» і «Контр-атака». Тэатр рыхтуе п'есу Прута «Мсьціслаў Удалы», якая адлюстроўвае эпізоды грамадзянскай вайны, а таксама «Жениться» Бальзамінова» Астроўскага.

Спэктаклі рабочага тэатру будуць адбывацца ў памяшканьні польскага дзяржаўнага тэатру.

Тэатр прабудзе ў Менску да 1 студзеня 1933 г. потым ён выяжджае на гастролі на Украіну.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Пра дапаўненьне арт. 129 Крымінальнага кодэксу п. «в» і пра скасаваньне п. «т» арт. 23 пастановы пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў і пра парадак накладаньня адміністрацыйных спагнаньняў.

У адпаведнасьці з пастановаю СНК БССР за 14-е мая 1932 г. «Пра ахову гэадэзычных знакаў» (З. З. СССР, 1932 г., № 36, арт. 218), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Дапоўніць арт. 129 Крымінальнага кодэксу п. «в» у наступнай рэдакцыі:

«в» (Наўмыснае псаваньне, зьнішчэньне і крадзеж пастаянных гэадэзычных знакаў) сьігналы, цэнтры трыангуляцыі, астранункты і базісы, нівэлірныя маркі і рэперы, якія ставяцца, або закладваюцца пры вядзеньні гэадэзычных работ, (асноўных, тапаграфічных, нівэлірных), а таксама перабудаваньне і перамяшчэньне іх бяз узгадненьня з органамі, пад ведамам якіх яны знаходзяцца, выклікае:

Штраф да 500 руб., або прымусовыя работы да аднаго году.

2. Скасаваць п. «т» арт. 23 пастановы ЦВК і СНК БССР «Пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў і пра парадак накладаньня адміністрацыйных спагнаньняў» (З. З. БССР, 1931 г., № 19, паст. 155).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР
К. ЬЭНЭК.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНУ п. «б» арт. 1 ПАСТАНОВЫ ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ СЫСТЭМЫ НАРОДНАЙ АСЬВЕТЫ.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць п. «б» арт. 1 пастановы ЦВК і СНК БССР за 25 сьнежня 1930 г. «Пра рэарганізацыю сыстэмы народнай асьветы (З. З. БССР, 1931 г., № 1, паст. 2) у наступнай рэдакцыі:

«б» адзіная працоўная савецкая палітэхічная сямігадовая школа двух тыпаў: фабрычна - заводзкая сямігадовая школа (ФЗС) і школа калгаснай моладзі (ШКМ) з 2-ма канцэнтрамі: першы канцэнтр — 4 гады навучаньня (8—12 гадоў) і другі канцэнтр—3 гады навучаньня (12—15 гадоў).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Ляўкоў.



На загпункце ўтыльсыравіны (Менск). На здымку: прыёмшчык сыпісвае квітанцыю здачы ўтыльсыравіны.

ХРОНІКА

▲ Двухдзекадзнік па ўнядрэньні дзіцячай кнігі ў вучнёўскіх масы праводзіць НКА і ЦБ ЮП з 1 лістапада. Двухдзекадзнік будзе праходзіць пад лёзунгамі: ніводнага піянэра і школьніка без кнігі, кніга—ленінцы Кастрычнікавы падарунак піянэру і школьніку.

▲ На 118 проц. выканала прамфінплян III кварталу арцель прамхарч у Менску.

▲ Дом вучоных арганізаваны ў Менску. Пры доме спэцыяльная бібліятэка, сталовая і медкуток.

▲ Вялікую падрыхтоўчую работу да будучых гастроляў па Украіне, Ленінграду і Сярэдняй Азіі праводзіць БДТ-1. Рыхтуецца канцэртная праграма пад рэжысэрствам тав. Рахленкі, якая будзе адлюстроўваць Беларусь царскую і Беларусь савецкую.

▲ Гомельскі яўрэйскі ТРАМ абмяркоўвае з Менскім і рэарганізоўваецца ў Цэнтральны Яўрэйскі Тэатр Рабочай Моладзі.

▲ Менскі гарком ЛКСМБ выдаў аднадзённую газэту «Камсамол у штурвала», прысьвечаную X-годзьдзю шэфства над лінкорам «Парыская камуна».

▲ Лесапільны завод імя Розы Люксэмбург (Барысаў) за 9 месяцаў выканаў плян па расьпілоўцы на 107 проц. Рабочыя заводу абвясьцілі IV квартал ударным.

▲ Калгас імя Ланцуцкага Хрыпянэўскага сельсавету (Магілёў) скончыў 4 кастрычніка ўборку бульбы з плошчы 46 га. У гэты-ж дзень калгас імя Сталіна Цяжарскага сельсавету скончыў уборку бульбы на плошчы 18 га.

▲ 11 кастрычніка раённая газэтай «Віцебскі пралетары» выпушчана чарговая літаратурная старонка. У старонцы зьмешчаны вершы і нарысы мясцовай сэкцыі ССП.

▲ 100 работнікаў сыстэмы Галоўдартрансу выехала на 4 дні на 5-ты дарбудаўчастак на ліквідацыю прарыву.

Выхаўшыя пастанавілі ўсе зароблены грошы ўнесьці на пабудову самалёту «Дарожнік».

▲ У мэтах прапаганды электрыфікацыі ў тагенным зваркі Навукова-тэхнічнае Выдавецтва Беларусі выпускае ў IV квартале 2 кніжкі па гэтым пытаньні.

▲ Рад абавязацельстваў да XV гадавіны Кастрычніка ўзялі на сябе калгаснікі Гатаўскага і Самахвалавіцкага сельсаветаў, сярод якіх: арганізацыя новых вытворчых брыгад, ўцягненьне лепшых калгасьнікаў і аднаасобнікаў у рады партыі і камсамолу і выкананьне ўсіх відаў загатовак.

▲ Фабрычна - заводзкія, саўгаснакалгасныя, шахматна-шашачныя, спаборніцтвы будуць праведзены з 1-га лістапада па 15 сьнежня, для падрыхтоўкі да шахматна-шашачнай частки ўсебеларускай спартакіяды.

▲ У падарунак да XV-годзьдзя Кастрычніка калгасьнікі калгасу «Пераможца» і «Вылучэнец», Пухавіцкага раёну абавязаліся адрамантаваць адзін кілёмэтр дарогі і выклікалі па сьледваць іх прыкладу астатніх калгасьнікаў Беларусі.

▲ Барысаўскі фанэрны завод выканаў плян III кварталу на 100,6 проц., па прадукцыйнасьці працы—на 109,7 проц., па сабекошту— на 100 проц. Завод узяў на буксір адстаючую фабрыку «Пралетарская перамога».

▲ Калгас «Чырвоны Кастрычнік» (Віцебскі раён) 9 кастрычніка завяршыў плян збожжазагатовак. Калгас здаў дзяржаве 410 кілё лікі і 307 кг. лёнасемя.

Беларускія пісьменьнікі у Харкаве

Брыгада савецкіх пісьменьнікоў Беларусі ў складзе Лынькова, Купалы, Александровіча, Галавача, Аксельрода і Баранавых якая была на ўрачыстым адчыненьні Дніпрадзержу, наведала Краматорск, дзе падрабязна знаёмілася з ходам будаўніцтва.

У Харкаве ў гонар прыбыцьця брыгады быў праведзен урачысты пленум Усеукраінскага арганізацыйнага савецкіх пісьменьнікаў, на якім Купала выступіў з чыткай сваіх твораў. На пленуме пісьменьнікі заключылі дамовы на творчае сацыялістычнае ўмацаваньне і вызначылі формы цішай сыстэматычнай сувязі. Усеукраінскі арганізацыйны камітэт пастанавіў выдаць юбілейны зборнік твораў Купалы на украінскай мове. Брыгада пабыла таксама на Харкаўскім прадпрыемстве і наведала Літаратурны інстытут імя Шэўчэнкі.

Апавяшчэньне

Сёньня, 19 кастрычніка роўна а 12 гадз. дня ў кабінэце сакратара менскага КП(б)Б т. Чарнушэвіча адбудзецца нарада, на якую запрашаюцца наступныя тт.:

Верба, Філаметаў (БКС), Жолудаў, Хадасэвіч, (ГКК), Ягораў, Балабанаў, Лісковіч, Войтаў, (ЦК КП(б)Б, Огульнік, Лур'е, Выдра, Левін, Краўчук, Львовіч, (Камвуз), Зярніцкі Шпітальнік, Драгілеў (КІЖ), Яфімаў (БДКІно), Масюкоў (НКЗем), Дзяніскевіч (ГК), Пятруковіч (Галоўміліцыя), Стракоўскі, Брыскін, (Белсампрамсаюз), Аксёнцаў, Вількоў (Х. Т. І.), Саўчанка (Радыёцэнтр), Саевіч (І. Г. П.), Конюхаў (А. Б. В. Ш.).

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУБАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня

Ад 19 кастрычніка на экране
Замежны мастацкі фільм
Страх
Паводле аднаіменнага твору Стэфана Цэйга
Звыш прагр. Кіно-хроніка Саюзкіно

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЯ“ Каса ад 12 гадз.

Мастацкі фільм САЮЗКІНО
Змова мярцьвякоў
Звыш програмы ПУСК ДНЕПРАБУДУ

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“
ПАТРЭБНЫ СТЫЛЬРЭДАКТАРЫ
Плата па згодзе

Бабруйская кантора „САЮЗТРАНС“
даводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў,
што на падставе распараджэньня аб'яднаньня „Саюзтранс“
Жлобінскі пункт ліквідуецца з 16 кастрычніка г. г.
Усе прэтэнзіі прад'явіць не пазьней 1-га лістапада ў ліквідацыйную камісію па адрасе: Жлобін, вул. Урыцкага 11.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія заявы прымацца ня будуць
ЛІКВІДКАМІСІЯ

Праектна-канструктарская кантора Будаб'яднаньня НКЛП
паведамляе
усе прадпрыемствы і ўстановы што яна выконвае да будаўнічага сэзону 1933 году розпага роду будаўнічыя праекты, як-та эскізныя праекты і рабочыя чарцяжы ф